Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

24 ЛІСТАПАДА 2015 г. АЎТОРАК № 227 (28085) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА




**Ці стане Каталонія незалежнай?**

СТАР. 5




**Наш лось на эмблеме польскага парку**

СТАР. 10



**Помнік Быкаву ў Мінску**

СТАР. 13

*ЛІЧБА ДНЯ*

**6-7%**

*за год дадатковага росту ВУП краіны можа ў перспектыве даць з'яўленне ў сталіцы шматфункцыянальнага комплексу «Мінск-Мір», лічыць кіраўнік упраўлення камерцыйнай нерухомасцю групы кампаній «Дана Холдынгс» Гэры Бероўз. Паводле яго слоў, комплекс сёння з'яўляецца самым вялікім праектам у Еўропе і ўжо прыцягвае замежных інвестараў. Будаўніцтва комплексу стартавала сёлета ў кастрычніку, ён размесціцца на плошчы 320 га на тэрыторыі былога аэрапорта «Мінск-1». Там з'явіцца 30 тысяч кватэр, новы парк плошчай 50 га, чатыры школы і дзевяць дзіцячых садкоў. Але асноўнай «разыначкай» комплексу стануць гандлёвы і фінансавы цэнтр. Плануецца, што міжнародны фінансавы цэнтр «Мінск-Мір» будзе абслугоўваць рэгіён, у якім пражываюць 300 млн чалавек.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.11.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 17976,00 | ▲ |
| Еўра | 19094,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 274,67 | ▼ |
| Укр. грыўня | 744,35 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# БАГАТЫЯ САЖАЛКІ

**Восень — гарачая пара на блакітнай ніве краіны. У апошнія гады рыбгасы павялічваюць вытворчасць сажалкавай рыбы, спрыяючь таму,каб багацейшым і здаравейшым быў стол нашых людзей. Адзін з найлепшых рыбгасаў рэспублікі, які паспяхова рэалізуе праграму развіцця, — «Лактышы» Ганцавіцкага раёна.**

СТАР. 3



Адгрузка жывой рыбы на гандлёвыя прылаўкі.



Чым цяжэйшы невад, там лепшы ўраджай блакітнай нівы.

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

■ Уклады

## ГАРАНТЫЯ ДОЎГАТЭРМІНОВАГА ФІНАНСАВАННЯ

**Рэалізацыя ўсіх пунктаў Дэкрэта №7 паспрыяе фарміраванню ўстойлівай рэсурснай базы ў банкаўскай сістэме і знізіць стаўкі па крэдытах**

**У нашай краіне з 12 лістапада ўведзены безадзыўныя банкаўскія ўклады, пры якіх датэрміновае вяртанне па ініцыятыве ўкладчыка не прадугледжваецца. Адпаведны Дэкрэт №7 «Аб прыцягненні грашовых сродкаў ва ўклады (дэпазіты)» быў падпісаны кіраўніком дзяржавы 11 лістапада.**

Таксама, згодна з дакументам, з 1 красавіка 2016 г. падаходным падаткам будуць абкладацца працэнтныя даходы, атрыманыя фізічнымі асобамі пры размяшчэнні грашовых сродкаў на бягучых банкаўскіх рахунках і ва ўкладах на тэрмін менш як 1 год — у беларускіх рублях, менш за 2 гады — у замежнай валюце. Што азначаюць новыя нормы для кліентаў банкаў, як быць уладальнікам так званых ашчадных картак, якія рэкамендацыі атрымаюць у найбліжэйшы час ад рэгулятара банкі — на гэтыя і іншыя пытанні падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА адказвалі спецыялісты банкаўскай сферы.

### СІТУАЦЫЯ СТАБІЛЬНАЯ І ПРАДКАЗАЛЬНАЯ

**Начальнік галоўнага ўпраўлення рэгулявання банкаўскіх аперацый Нацыянальнага банка Беларусі Ілона ЛЯДНІЦКАЯ** адзначыла, што з 12 лістапада банкаўская сістэма ў частцы дэпазітаў і самі ўкладчыкі дзейнічаюць у новым фармаце. Увогуле, Дэкрэт №7 распрацаваны для стымулявання доўгатэрміновых зберажэнняў у банкаўскай сістэме. Безумоўна, Нацыянальны банк чакаў усплёску актыўнасці насельніцтва на дэпазітным рынку. Але за мінулы тыдзень усплёск актыўнасці быў нават ніжэйшым, чым прагназавалі эксперты рэгулятара.

Безумоўна, насельніцтву неабходна асэнсаваць новаўвядзенні на рынку ўкладаў, у тым ліку з пункту гледжання размяшчэння іх у банкаўскай сістэме. Спадарыня Лядніцкая паведамляе, што цяпер насельніцтва набывае аблігацыі банкаў, грошы пераразмяркоўваюцца на бягучыя рахункі. У цэлым у банкаўскай сістэме першы ўсплёск актыўнасці насельніцтва ўжо спадае. У сваю чаргу банкі аператыўна адрэагавалі на ўступленне ў сілу Дэкрэта №7 і цяпер прапануюць лінейку прадуктаў у адпаведнасці з нормамі дэкрэта. Такім чынам, сітуацыя развіваецца так, як гэта меркавалася першапачаткова.

СТАР. 4

## ЧАРАЎНІЦТВА Ў САФІІ

**На дзіцячым «Еўрабачанні-2015» перамагла Мальта**

**Ноччу 21 лістапада раскрылася інтрыга міжнароднага дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне-2015». Перамогу ў балгарскай Сафіі заваявала прадстаўніца Мальты Дэстыні Чукуньерэ з вынікам 185 балаў. Менавіта яе выступленне з песняй «Не мая душа» па выніках галасавання журы і тэлеглядацкай аўдыторыі прызнана самым лепшым. Канкурсант ад Беларусі Руслан Асланаў увайшоў у пяцёрку першых — заняў 4 месца, атрымаўшы 105 балаў. Увогуле топ-5 (па колькасці набраных балаў) выглядае наступным чынам: Мальта (185), Арменія (176), Славенія (112), Беларусь (105) і Албанія (93).**

Пра пераможцу сёлетняга конкурсу мы ведаем, што дзяўчына мае шматлікія ўзнагароды на розных фестывалях. Напрыклад, на Singer Stage International Festival яна атрымала гран-пры, таксама была прадстаўніцай Мальты на музычным фестывалі для дзяцей у Сан-Рэма ў 2013 годзе, дзе перамагла. Што ж да дзіцячага «Еўрабачання-2015», то нельга сказаць, быццам перамога яе стала нечаканасцю. Прыгожая песня «Не мая душа», моцны голас і харызматычная выканаўца, думаю, запомніліся многім.

Як і выступленне Міка з Арменіі. Яго кампазіцыя «Любоў» была на конкурсе гэтага года, бясспрэчна, адной з самых запамінальных і дынамічных. Ліна Кудузавіч, нагадаю, падзялілася з публікай сваёй гісторыяй перажывання «Першага кахання». А «Чараўніцтва» ў выкананні нашага Руслана Асланава — той прыклад, дзе былі гарманічна паяднаны і талент выканання, і пастаноўка нумара.

СТАР. 3



Фота БЕЛТА.

# ЗРАБІЦЬ ЗНАЧНЫ РЫВОК НАПЕРАД

## Беларусь і Ленінградская вобласць маюць намер пачаць прарыў у гандлі з сельскай гаспадаркі, будаўніцтва і машынабудавання

**Аб гэтым учора Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заявіў на сустрэчы з губернатарам Ленінградскай вобласці РФ Аляксандрам Драздзенкам, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што сярод рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі Ленінградская вобласць уваходзіць у лік традыцыйна ключавых гандлёва-эканамічных партнёраў Беларусі. Ён нагадаў, што сустрэча з Аляксандрам Драздзенкам трохгадовай даўнасці ў значнай ступені садзейнічала стабільнаму росту тавараабароту, які ў мінулым годзе перасягнуў паўмільярда долараў. Сёння, на жаль, намецілася тэндэнцыя да зніжэння аб'ёмаў узаемнага гандлю, канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

«Таму мы зацікаўлены не толькі выраўнаваць сітуацыю, але і зрабіць значны рывок наперад. І пачынаць нам трэба з такіх традыцыйных напрамкаў двухбаковага супрацоўніцтва, як сельская гаспадарка, будаўніцтва, прадукцыя машынабудавання», — упэўнены Прэзідэнт.

У Расіі добра зарэкамендавала сябе беларуская сельскагаспадарчая тэхніка. У прыватнасці, амаль палавіна трактарнага парка ў Ленінградскай вобласці ўкамплектавана мінскімі трактарамі. «Мы гатовы павялічыць пастаўкі ў рамках вашай дапамогі вяскоўцам у набыцці тэхнікі за кошт вашага бюджэту, калі ў гэтым ёсць неабходнасць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

У сваю чаргу беларускія аграрыі зацікаўлены ў наладжванні пастаянных сувязей з племяннымі заводамі малочнай жывёлагадоўлі Ленінградскай вобласці. Прэзідэнт звярнуў увагу, што ў гэтай сферы ў Ленінградскай вобласці, якая заўсёды была флагманам у такіх адносінах, ёсць чаму павучыцца. «Мадэрнізуючы сельскую гаспадарку ў Беларусі, мы апіраліся ў тым ліку на ваш вопыт і шмат куплялі ў вас племянной жывёлы», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Беларускія вучоныя могуць падзяліцца багатым вопытам у сферы раслінаводства, селекцыі і насеннаводства бульбы, збожжавых, зернебабовых культур, прадоўжыў Аляксандр Лукашэнка. Добрыя перспектывы адкрываюцца ў будаўнічай сферы. Прадпрыемствы «Краснасельскбудматэрыялы» і «Крычаўцэментнашыфер» гатовы экспартаваць цэмент, «Керамін» — керамічную плітку, «Гомельшкло» — паліраванае шкло. «Нашы будаўнічыя арганізацыі прапануюць свае паслугі ў рэалізацыі праграм Ленінградскай вобласці ад праектавання да здачы аб'ектаў пад ключ», — дадаў Аляксандр Лукашэнка. Яшчэ адным важным напрамкам узаемадзеяння ён назваў пастаўку беларускай пасажырскай, грузавой, камунальнай, дарожнай і іншай тэхнікі.

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў Беларусі ёсць добры вопыт супрацоўніцтва з Санкт-Пецярбургам, які пераходзіць да эксплуатацыі аўтобусаў МАЗ, што працуюць на газаматорным паліве. «З улікам перспектыў будаўніцтва ў Ленінградскай вобласці комплексу аўтамабільных газанапаўняльных кампрэсарных станцый у супрацоўніцтве з Беларуссю ў гэтай сферы адкрываюцца істотныя магчымасці», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, цяпер самы зручны час для таго, каб перагледзець напрамкі супрацоўніцтва Беларусі і Ленінградскай вобласці. «Стратэгічна мы абсалютна правільна вызначыліся, гэта прыносіць вынік. А вось ва ўмовах, што змяніліся, асабліва апошнім часам, нам трэба паглядзець іншымі вачамі на нашы ўзаемаадносіны», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

Ленінградская вобласць зацікаўлена ў набыцці беларускага селекцыйнага насення, ужо ёсць добрыя напрацоўкі па бульбе і збожжавых, заявіў Аляксандр Драздзенка. Паводле яго слоў, Ленінградская вобласць увайшла ў пілотны праект, які будзе падтрымлівацца з бюджэту Расійскай Федэрацыі, па стварэнні насенняводча-селекцыйнага цэнтра. «Мы разлічваем, што беларускія спецыялісты, нашы традыцыйныя партнёры, прымуць удзел у стварэнні гэтага цэнтра, нас падтрымаюць і мы сумесна будзем працаваць», — сказаў ён. Губернатар Ленінградскай вобласці адзначыў, што гэта стане крокам наперад у двухбаковым супрацоўніцтве.

На сустрэчы таксама абмяркоўвалася неабходнасць у будаўніцтве ў Ленінградскай вобласці сэрвіснага цэнтра беларускай тэхнікі.

# ТАЛЕНТУ АДКРЫТЫ ЎСЕ ДАРОГІ

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў лаўрэатаў, стыпендыятаў, дыпламантаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі з 20-годдзем з дня ўтварэння фонду. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

«Вашы дасягненні шырока вядомы не толькі на радзіме, але і далёка за яе межамі, а ваш прыклад служыць добрым арыенцірам для равеснікаў і яркім пацвярджэннем таго, што для талентаў у нас адкрыты ўсе дарогі», — гаворыцца ў віншаванні.

Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што лаўрэаты, стыпендыяты і дыпламанты фонду будуць і ў далейшым раскрываць свой творчы патэнцыял, працаваць над рэалізацыяй яркіх культурных праектаў, якія ўзбагацяць скарбонку нацыянальнага мастацтва і прынясуць яму шырокае прызнанне ў свеце.

■ Парламенцкі дзённік

# Праблема ў пасылках

## І адсутнасці належнага падатку

**У Савеце Рэспублікі абмяркавалі неабходнасць плаціць больш падаткаў за пасылкі з таварамі з-за мяжы, якія заказваюць беларусы праз інтэрнэт. На думку старшыні верхняй палаты парламента Міхаіла МЯСНІКОВІЧА, іх ацэначная вартасць наўмысна заніжаецца.**

Спікер заўважыў, што за першае паўгоддзе гэтага года жыхары Беларусі атрымалі 4 400 000 пасылак з таварамі з іншых краін. «Яны ацэньваюцца ў 5-10 долараў, хоць на самой справе іх фактычны кошт зусім іншы, таму бюджэт недаатрымлівае ПДВ, пошліны, — сказаў ён. — Я не супраць таго, каб куплялі, але ідзе падробка фактычнага кошту. Гэта дазваляе пазбягаць мытных пошлін, плацяжоў і г.д.»

Раней парламентарый прапаноўваў увесці ПДВ (падатак на дабаўленую вартасць) на такія пасылкі з таварамі, але Нацыянальны банк не пагадзіўся, спаслаўшыся, што праграмнае забеспячэнне не дазваляе гэта зрабіць.

— Я лічу, што такі падыход няправільны. Буду на гэтым настойваць. Бо, калі мы прыходзім у краму, на касе прабіваюць ПДВ, і праграмнае забеспячэнне спрацоўвае. Кожны пакупнік выплачвае падатак. У нас ёсць рэгістрацыя на кожную пасылку. Пры яе ўручэнні можна гэтае пытанне вырашыць, — упэўнены старшыня Савета Рэспублікі.

Міхаіл Мясніковіч таксама лічыць, што такога кшталту пасылкі «абвалілі» беларускі гандаль і стварылі праблемы для прамысловасці. «Гэта вялікія страты для бюджэту», — падкрэсліў ён. Па яго словах, Еўразійская эканамічная камісія ўжо абмяркоўвае пытанне ўвядзення падатку на інтэрнэт-гандаль. Гаворка ідзе аб прагрэсіўнай шкале падаткаў на пасылкі з таварамі з інтэрнэт-крам, якія звонку паступаюць у ЕАЭС.

Абмеркаванне ацэначнай вартасці пасылак прайшло падчас пасяджэння маніторынгавай групы з удзелам прадстаўнікоў Нацбанка, Дзяржкантролю і іншых ведамстваў. Акрамя таго, абмеркаваны праекты бюджэтных дакументаў на 2016 год. Чакаецца, што ў хуткім часе законапраекты бюджэтнага пакета паступяць у парламент.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■ Знешняя палітыка

# Спыніць падзенне

## Праграму па развіцці экспарту на наступную пяцігодку абмеркавалі ў МЗС

**Міністр замежных спраў Уладзімір Макей сустрэўся з кіраўнікамі 45 вядучых прадпрыемстваў-экспарцёраў краіны. Адной з тэм сустрэчы стала Нацыянальная праграма па развіцці экспарту на 2016—2020 гады.**

На нарадзе прысутнічалі прадстаўнікі прадпрыемстваў з розных галін вытворчасці: будаўнічай, дрэваперапрацоўчай, хімічнай, харчовай прамысловасці.

— Мы традыцыйна збіраемся з нашымі вядучымі экспарцёрамі ў канцы года, — адзначыў Уладзімір Макей, — каб з улікам мінулага перыяду вызначыць самыя галоўныя праблемы, якія перашкаджаюць павялічваць аб'ёмы, а таксама мэты і задачы на будучыню. А яшчэ мы зараз працуем над Нацыянальнай праграмай развіцця экспарту на 2016—2020 гады. Неабходна абмяняцца думкамі наконт таго, што трэба зрабіць не толькі ў наступным годзе, але і на сярэднетэрміновую перспектыву. Мы павінны прадметна абмеркаваць, як больш актыўна працаваць у экспартным кірунку, і ўнесці прапановы па пераадоленні перашкод, якія існуюць сёння.

Па словах міністра замежных спраў, у знешнім гандлі цяпер склалася няпростая сітуацыя.

— «Аселі» знешнія рынкі, значна знізіўся беларускі экспарт. Так, за 9 месяцаў бягучага года ён склаў 75,7% ад узроўню мінулага года за аналагічны перыяд. Найбольш істотнае падзенне экспартных паставак адбылося ў будаўнічай галіне, лёгкай прамысловасці, дрэваапрацоўцы. Выклікае асаблівую занепакоенасць сітуацыя на прадпрыемствах Віцебскай і Гродзенскай абласцей.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Тэорыя на практыцы

# МАКСІМАЛЬНА БЛІЗКА ДА РЭАЛЬНАСЦІ

## У Акадэміі кіравання з'явілася аўдыторыя, у якой можна здымаць кіно

**Калі ў такім кіно спатрэбіцца эпізод у зале суда. Аднак аўдыторыя гэтая — з высокімі, прадстаўнічымі крэсламі для суддзяў, залай для публікі, а таксама са спецыяльнымі месцамі для народных засядацеляў, пракурораў, сведак, адваката і іншых удзельнікаў крымінальнага, адміністрацыйнага і грамадзянскага працэсу — створана зусім не для таго, каб зарабляць на арэндзе кінастудыям. Прызначэнне гэтай максімальна набліжанай да рэальнасці копіі залы судовых пасяджэнняў — практыкаарыентаванае навучанне юрыстаў-кіраўнікоў новага пакалення.**



Урачыстае адкрыццё незвычайнай вучэбнай аўдыторыі адбылося ўчора, 23 лістапада, у галоўным корпусе Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (вуліца Маскоўская, 17). Адкрылі яе **Генеральны пракурор Аляксандр КАНЮК** і **рэктар акадэміі Марат ЖЫЛІНСКІ**. Яны ў прысутнасці кіраўніцтва Генеральнай пракуратуры, студэнтаў і журналістаў падпісалі адпаведнае пагадненне, паціснулі адзін аднаму рукі і адказалі на некалькі пытанняў для прэсы.

І ўсё гэта адбывалася ў рамках адкрытай каардынацыйнай нарады кіраўніцтва пракуратуры, якая праходзіла ў той жа дзень у канферэнц-зале Акадэміі кіравання і на якую былі запрошаны студэнты і выкладчыкі гэтай навучальнай установы.

Такім чынам тут звыкла сумясцілі вучобу і практыку.

— Гэтая вучэбная аўдыторыя будзе задзейнічана ў рамках навучальнага працэсу ў нашай акадэміі, прычым у рамках тых спецыяльнасцяў, якія ў нас ужо адкрыліся і яшчэ будуць адкрывацца, — сказаў Марат Жылінскі. — У 2016 годзе ў нас будзе адкрыта спецыяльнасць «Дзяржаўнае кіраванне пракурорскім наглядам». Гэта наш невялікі ўнёсак у агульную справу па падрыхтоўцы юрыстаў, кіраўнікоў і пракурорскіх работнікаў.

Пасяджэнні ў вучэбнай судовай зале будуць праходзіць у форме гульнявых працэсаў, але ў прысутнасці рэальных суддзяў, пракурораў і адвакатаў, якія падзеляцца са студэнтамі сваім вопытам, раскажуць аб прызначэнні кожнага з атрыбутаў судовай улады.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

— Адукацыйны працэс заўсёды быў актуальным пытаннем, але сёння яшчэ ідзе і актыўная фаза судова-прававой рэформы, і гэты працэс мае на ўвазе ўнясенне канструктыўных змен і дапаўненняў у падрыхтоўку кадраў для пракуратуры, — сказаў у сваю чаргу Аляксандр Канюк. — Такія прадметныя залы заслугоўваюць асаблівай увагі і пашаны. Тут можна праводзіць заняткі па цэлым комплексе прадметаў. Узровень адукацыі, падрыхтоўкі досыць высокі ў Акадэміі кіравання, і гэта натуральна для прэзідэнцкай структуры.

Генеральны пракурор заўважыў, што вучэбная зала ў гэтай навучальнай установе выканана на вельмі высокім прафесійным узроўні, з веданнем справы. Ён дадаў, што цяпер у некалькіх ВНУ, у тым ліку ў Акадэміі кіравання, чытаецца так званы антыкарупцыйны курс, які карысна ведаць не толькі тым, хто атрымлівае першую вышэйшую адукацыю, але і тым, хто ўжо працуе, у тым ліку юрыстам высокага ўзроўню.

— Вывучэнне новага Закона аб карупцыі патрабуе асаблівых умоў, там вельмі шмат пытанняў, якія павінны ведаць слухачы акадэміі, — лічыць Аляксандр Канюк. — Закон мае вельмі шмат нававядзенняў, якія патрабуюць тлумачэння. І на гэтым яго развіццё не закончыцца, бо гэта перманентны працэс.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.** *medvedeva@zviazda.by*

# «ЖЫЦЦЁ ДАРАЖЭЙ, ЧЫМ ШЫНЫ!»


Фота БЕЛТА.

**Пад такой назвай сёння распачынаецца маштабная рэспубліканская акцыя, скіраваная на папярэджанне дарожна-транспартных здарэнняў і пашырэнне выкарыстання зімніх шын.**

Як паведаміла **Ганна БАНАДЫК, старшы інспектар па асаблівых даручэннях УДАІ МУС**, у дні акцыі супрацоўнікі ДАІ будуць праводзіць з кіроўцамі тлумачальныя гутаркі. У тым ліку і аб Указе Прэзідэнта «Аб мерах па павышэнні бяспекі дарожнага руху», які прадугледжвае з 1 снежня па 1 сакавіка абавязковае абсталяванне транспартных сродкаў зімнімі шынамі, аб адказнасці за падобнае парушэнне...

Як паясніла спадарыня Ганна, сезонна мяняць шыны абавязкова трэба на аўтамабілях з тэхнічна дапушчальнай агульнай масай да 3,5 тоны ўключна, легкавых і грузапасажырскіх — звыш 3,5 тоны, а таксама аўтобусаў з тэхнічна дапушчальнай агульнай масай да 5 тон.

Зімнюю «гуму» ўстанаўліваюць на ўсіх колах аўтамабіля. Пры набыцці варта звярнуць увагу на маркіроўку. Шыны мусяць быць абазначаны значком у выглядзе горнай вяршыні з трыма пікамі і сняжынкай усярэдзіне альбо знакамі «M+S», «M&S», «M.S», «M S» ці «All seasons».

**Якаў ЖУРБІН.**

■ Надвор'е

# УЖО НЕ МЕСЯЦ МАЙ...

## Уначы прагназуюцца замаразкі, а ўдзень — часам снег і каля нуля

**На гэтым тыдні на тэрыторыі Беларусі ўсталюецца халоднае з ападкамі надвор'е, паведаміла начальнік сектара кароткатэрміновых прагнозаў Белгідраметцэнтра Людміла ПАРАШЧУК.**

Спецыяліст лічыць, што на надвор'е будуць уплываць няўстойлівыя паветраныя масы, калі ападкі чакаюцца ў выглядзе снегу і мокрага снегу. Тэмпературны фон на працягу тыдня ўначы будзе адмоўны, а ўдзень прыкладна каля нуля.

Ужо з панядзелка ў Беларусь пачалі паступаць паветраныя масы з паўночных раёнаў Еўропы і прынеслі з сабой паніжэнне тэмпературы паветра і ападкі ў выглядзе снегу. Невялікі мокры снег прагназуецца і ў аўторак. Месцамі магчымы слабы туман, галалёд, на асобных участках дарог галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе ад мінус 1 да плюс 4 градусаў. А вось у сераду ўвогуле будзе пераважна без ападкаў, толькі ўначы ў асобных раёнах Віцебскай і Магілёўскай абласцей прагназуецца невялікі кароткачасовы снег. Месцамі чакаецца слабы туман, галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 2-7 марозу, месцамі да мінус 10 градусаў. Удзень чакаецца да мінус 4 да плюс 2 градусаў.

Амаль без ападкаў будзе ў чацвер, толькі ўдзень на паўднёвым захадзе краіны прагназуецца невялікі кароткачасовы снег. На асобных участках дарог магчымая галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 1-7 градусаў, па ўсходзе месцамі будзе да 10 марозу. Удзень прагназуецца ад мінус 4 да плюс 2 градусаў. Снег, мокры снег і слабы галалёд чакаецца ў пятніцу. На дарогах месцамі галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 1-8 градусаў, удзень будзе ад мінус 3 да плюс 3 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*



# УСЕ АЛІМПІЙЦЫ Ў ГОСЦІ ДА НАС!

## Мінск прыме 45-ю Генасамблею ЕАК

**Такое рашэнне агучана па выніках галасавання прадстаўнікоў усіх пяцідзесяці кантынентальных Нацыянальных алімпійскіх камітэтаў.**



У папярэдняй заяўцы ў барацьбе за правядзенне Генеральнай асамблеі Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў у 2016 годзе значыліся тры краіны: Арменія, Беларусь і Мальта. Канчатковы спіс прэтэндэнтаў быў агучаны 21 лістапада. За дадзенае права змагаліся Ерэван і Мінск. Прэзідэнт НАК Арменіі Гарык Царукян у сваім выступленні заявіў, што, улічваючы сяброўскія адносіны і павагу да Прэзідэнта НАК Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, Ерэван здымае сваю заяўку на карысць Беларусі.

Удзельнікам Генасамблеі прэзентацыю «Мінск-2016» прадставіў **першы віцэ-прэзідэнт НАК Беларусі Максім РЫЖАНКОЎ**. На працягу двух дзён у выставачнай зоне ўсе наведвальнікі стэнда «Мінск-2016» знаёміліся з дзейнасцю НАК Беларусі, маглі атрымаць усю неабходную інфармацыю аб краіне і горадзе.

Пазней адбылася працэдура галасавання, па выніках якой беларуская заяўка была аб'яўлена пераможцай.

**Прэзідэнт ЕАК Патрык ХІКІ** абвясціў, што менавіта беларуская сталіца прыме Генасамблею ў 2016 годзе. Ён запэўніў, што для еўрапейскай алімпійскай сям'і гэта будзе сапраўды важны і запамінальны візіт, бо Беларусь ужо правяла на высокім узроўні шэраг буйных спартыўных мерапрыемстваў.

У НАК Беларусі адзначаюць, што «арганізацыя такога форуму ў наступным годзе стане знакавай падзеяй у Мінску і ў спартыўным жыцці Еўропы, дазволіць умацаваць імідж і аўтарытэт Рэспублікі Беларусь як сацыяльна арыентаванай дзяржавы, надаваць асаблівую ўвагу прапагандзе алімпійскіх ідэалаў, здаровага ладу жыцця, развіццю фізічнай культуры і спорту».

Адзначым, што ў гэтыя дні адбылася рабочая сустрэча беларускай дэлегацыі з **прэзідэнтам МАК Томасам БАХАМ**, які выказаў зацікаўленасць у наведванні Мінска ў 2016 годзе ў рамках Генасамблеі. Ён выказаў таксама жаданне сустрэцца з легендарнымі беларускімі фехтавальшчыкамі Аляксандрам Раманьковым і Аленай Бяловай, з якімі ён выступаў на Алімпійскіх гульнях.

У пасяджэнні Генасамблеі прынялі ўдзел прадстаўнікі ўсяго алімпійскага руху, у тым ліку прэзідэнты МАК, АНАК, ЕАК, лідары кантынентальных асацыяцый МАК, прадстаўнікі НАКаў, міжнародных спартыўных федэрацый, арганізацыйных камітэтаў Алімпійскіх і Паралімпійскіх гульняў, Юнацкіх Алімпійскіх гульняў, Еўрапейскіх юнацкіх алімпійскіх фестываляў.

Беларускую афіцыйную дэлегацыю прадставілі першы віцэ-прэзідэнт НАК Максім Рыжанкоў і генеральны сакратар Анатоль Котаў. У форуме ўзялі таксама ўдзел намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Прывалаў, саветнік НАК і кіраўнік камісіі ЕАК па Алімпійскіх гульнях Георгій Катулін і супрацоўнікі аргкамітэтаў Еўрапейскага юнацкага алімпійскага фестывалю «Мінск-2019» і Генасамблеі «Мінск-2016».

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

# БАГАТЫЯ САЖАЛКІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



У прадпрыемства сёння звыш 2,5 тысячы гектараў сажалкавых плошчаў. Акрамя гэтага, у арэнду ўзята вадасховішча, якое забяспечвае выроставыя і нагульныя сажалкі вадой. Побач з традыцыйнымі для вадаёма відамі рыб: шчупаком, карасём, ляшчом — тут разводзяць карпа, таўсталобіка, белага амура. Сёлета з вадасховішча вылаўлена каля 12 тон рыбы пры плане 13,2 тоны.

А ўсяго ў «Лактышах» гэтай восенню здабылі звыш 500 тон таварнай рыбы. Аднак да канца года яшчэ далёка, і рыбацкі невад значна пацяжэе. Гэта значыць, што лактышоўцы стрымаюць дадзенае ў пачатку года слова і выканаюць ганаровы план — 650 тон таварнай прадукцыі і 126 тон рыбапасадачнага матэрыялу.

— У аснове поспеху, — падкрэслівае **дырэктар рыбгаса «Лактышы» Сямён ШУСТ** *(на фота)*, — шмат фактаў. Гэта ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы, укараненне найноўшых тэхналагічных працэсаў, гаспадарскае стаўленне да справы, у тым ліку ахова вадаёмаў і здабытага «ўраджаю».

**Аляксандр ШАБЛЮК. Фота аўтара.**


**Вось такія карпы гадуюцца ў «Лактышах». Рыбавод Сяргей САВЕНЯ і майстар Аляксандр ФЯДОСАЎ.**

# ЧАРАЎНІЦТВА Ў САФІІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прадстаўніца Албаніі Мішэла Рапо палюбілася публіцы за яе песню «Джамбае»... Сярод іншых канкурсантаў можна вылучыць яшчэ выступленне дэбютанткі дзіцячага «Еўрабачання-2015» Аўстраліі, а яшчэ Ірландыі, Балгарыі і Сербіі.

На пачатку падвядзення вынікаў кожная краіна-ўдзельніца атрымала 12 балаў ад Еўрапейскага вяшчальнага саюза. Потым 8 балаў Беларусі паставіла дзіцячае міжнароднае журы конкурсу, а пасля гэтага мы даведаліся, як прагаласавалі за выступленне нашага канкурсанта ў розных краінах. 10 балаў мы атрымалі ад Расіі, 8 — ад Грузіі, 7 нашаму Руслану паставілі Сан-Марына, Украіна, Ірландыя, Аўстралія і Нідэрланды, ад Сербіі і Арменіі атрымалі па 5 балаў, 4 — ад Мальты і Македоніі, толькі ў 3 балы ацанілі «Чараўніцтва» ў Балгарыі і Славеніі. Яшчэ два балы далі нам ад Італіі. У сваю чаргу, беларускай тэлеаўдыторыі найбольш спадабаліся выступленні Арменіі (12), Мальты (10) і Славеніі (8).

Ужо ў нядзелю днём беларуская дэлегацыя і юны артыст прыляцелі ў Мінск. У аэрапорце Руслана сустрэлі прыхільніцы і журналісты. На кветкі, цёплыя словы ў свой адрас і апладысменты канкурсант рэагаваў стрымана:

— Вельмі прыемна ўсё, што са мной зараз адбываецца. Як і тое, калі адчуваеш падтрымку адсюль сяброў і гледачоў, знаходзячыся на конкурсе. Выходзіць на сусветную сцэну складана, але я пастараўся сумясціць прыемнае з карысным, — падзяліўся Руслан Асланаў. — З усімі канкурсантамі мы пасябравалі. І гэты тыдзень быў багаты на ўражанні. Я многае ўбачыў і шмат чаму навучыўся. Мы выкладаліся напоўніцу. Зрабілі, што было ў нашых сілах. У нас была самая вялікая група падтрымкі, што, безумоўна, мне дапамагала. І я ўжо неяк адзначаў: раз такі вынік атрымаўся, то ў мяне ёсць яшчэ тры гады, каб падрыхтавацца да дарослага конкурсу «Еўрабачання».

Таксама сваімі ўражаннямі і ацэнкамі падзялілася **выкладчыца вакалу нашага канкурсанта Вольга АРЛОВА**: «Я верыла ў нашу перамогу, і, можна сказаць, мы перамаглі. Ганаруся Русланам. І я ўпэўнена, што ён яшчэ неадночы прынясе нашай краіне вялікія перамогі. Дзеці на конкурсе вельмі моцныя. Спадабалася мне, напрыклад, Аўстралія, аднак тэлегледачы не ацанілі яе да канца пачулі і разгледзелі. Хоць аўдыторыя ў зале магла чуць шыкоўнае выступленне. Канкурсантка з Сербіі была цудоўнай. У Дэстыні з Мальты спадабаліся і вакал, і тэмбр голасу, і тое, як яна падводзіла сябе. Я з першых дзён вызначыла для сябе, што яна і наш Руслан — самыя моцныя вакалісты, якія могуць прэтэндаваць на перамогу. За гэты тыдзень я таксама атрымала каласальны вопыт працы з сапраўднымі прафесіяналамі. І ў нас былі самыя лепшыя балельшчыкі. І мне прыемна адзначаць, што мы, беларусы, умеем падтрымліваць сваіх».



Чарговы конкурс дзіцячага «Еўрабачання» стаў гісторыяй. І старонка з выступленнем на ім Руслана Асланава — сведчанне, што Беларусь сёлета на ім была прадстаўлена годна.

**Алена ДРАПКО.** *drapko@zviazda.by*

# ГАРАНТЫЯ ДОЎГАТЭРМІНОВАГА ФІНАНСАВАННЯ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У гэтай сітуацыі Нацбанк падтрымалі і камерцыйныя банкі краіны. **Намеснік старшыні праўлення акцыянернага таварыства «Пріорбанк» Сяргей ШЫШОЎ** лічыць, што з'яўленне Дэкрэта №7 — гэта рух да цывілізаванага фінансавага рынку. З аднаго боку, укладчык зацікаўлены ў атрыманні максімальнага прыбытку з укладу ў банку, але мінулая сістэма не стымулявала доўгатэрміновых дэпазітаў. З увядзеннем новага дэкрэта банкі становяцца больш устойлівымі з пункту гледжання ліквіднасці. Укладчыкі гэтага прыватнага банка сустрэлі навіну спакойна, з разуменнем, а спецыялісты сёння рыхтуюць для іх новыя прадукты, якія змогуць зрабіць сапраўды камфортным абслугоўванне кліентаў гэтай фінансавай установы.

**Старшыня праўлення МТБанка Андрэй ЖЫШКЕВІЧ** адзначыў, што і іх чаканні былі крыху больш песімістычнымі, чым аказалася на практыцы. Па гэтым банку ў апошні тыдзень назіраўся нават прырост укладаў. Тут з'явілася новая лінейка, якая прадугледжвае безадзыўныя з прэферэнцыямі з пункту гледжання працэнтнай стаўкі і адзыўныя ўклады. Кіраўнік гэтай фінансавай установы лічыць, што дзяржава зараз дапамагае банкам матываваць укладчыкаў на больш рацыянальныя паводзіны: па больш доўгіх укладах і стаўкі вышэйшыя, і падатковыя прэферэнцыі ёсць. Сапраўды, і дзяржава, і банкі працуюць цяпер на матывацыю ўкладчыкаў размяшчаць сродкі надоўга. Гэта правільна з пункту гледжання доўгатэрміновых эфектаў у эканоміцы.

## БОНУСЫ ДЛЯ ЭКАНОМІКІ І НЕ ТОЛЬКІ

Сёння кажуць, што нормы гэтага дэкрэта трохі непапулярныя. Калі паглядзець з іншага боку, якія ўсё ж такі бонусы ў сярэднетэрміновай і доўгатэрміновай перспектыве атрымаюць грамадзяне Беларусі пры рэалізацыі гэтага дакумента? На гэты конт Ілона Лядніцкая лічыць, што нават з пункту гледжання тых жа грамадзян, якія размяшчаюць сродкі ў банках, дакладна выключаюцца для сябе магчымасці доўгатэрміновага альбо кароткатэрміновага размяшчэння (пры гэтым фарміруюць ўстойлівую рэсурсную базу ў банкаўскай сістэме, якая не залежыць ад нейкіх часовых спекуляцыйных усплёскаў альбо адтокаў у пэўныя перыяды, асноўны чаканы эфект, безумоўна), — гэта зніжэнне памеру працэнтаў па банкаўскіх крэдытах як для рэальнага сектара эканомікі, так і для саміх грамадзян.

## І ВАЛЮТУ, І РУБЛІ — БЕЗ АБМЕЖАВАННЯЎ

Асобныя ўкладчыкі асцерагаюцца, паведамляе БЕЛТА, што банкі могуць абмежаваць зняцце сродкаў з дзейных валютных укладаў, а таксама выдаваць валютныя ўклады ў рублях з-за недахопу валюты. Ілона Лядніцкая ўпэўнена, што такія развážанні кліентаў зусім беспадстаўныя. Дзеянне Дэкрэта №7 не распаўсюджваецца на дагаворы, заключаныя да 12 лістапада 2015 года. Банкі абавязаны выконваць свае абавязацельствы ў тэрміны і ў аб'ёмах, прадугледжаных дагаворамі, а таксама ў той валюце, у якой размешчаны ў банку грашовыя сродкі. Гэта патрабаванне заканадаўства. «Хачу падкрэсліць, што на сённяшні дзень праблем няма з выкананнем банкамі сваіх абавязацельстваў па дагаворах. Няма ніводнага звароту ад фізічных асоб з гэтай нагоды», — падкрэсліла прадстаўнік Нацбанка. Спецыялісты камерцыйных банкаў дадалі, што, згодна з дзейным заканадаўствам, яны абавязаны вярнуць уклад у той валюце, якую ўнёс укладчык, і ў вызначаныя дагаворам тэрміны. Тут няма ні маральных, ні прававых падстаў змяніць валюту абавязацельстваў перад кліентам. Больш за тое, Нацбанк цяпер вельмі старанна аналізуе справаздачнасць банкаў і працягне ўважліва сачыць за сітуацыяй з абслугоўваннем валютных пасіваў.

## БАНКІ АБЯЦАЮЦЬ ПРЫСЛУХОЎВАЦЦА І ЎЛІЧВАЦЬ АБСТАВІНЫ КЛІЕНТАЎ ІНДЫВІДУАЛЬНА

Нормы Дэкрэта №7 вызначаюць, што ў выключных выпадках вярнуць безадзыўны ўклад будзе магчыма. Хто і як будзе вызначаць гэтыя выпадкі? Ілона Лядніцкая лічыць, што банкі будуць самастойна вызначаць выключнасць выпадку. Пры прыняцці такога рашэння ўстановамі будзе прымяняцца індывідуальны падыход да канкрэтнага выпадку з улікам сітуацыі, якая ўзнікла, і з прад'яўленнем усіх неабходных дакументаў.

Сяргей Шышоў паведаміў, што «Пріорбанк» таксама прытрымліваецца пазіцыі, што сацыяльны аспект тут адыгрывае важную ролю. Пры наяўнасці сур'ёзных абставін, звязаных з няпростымі жыццёвымі сітуацыямі, «мы гатовы разглядаць пытанне аб датэрміновым вяртанні безадзыўнога ўкладу». Такія пытанні павінны разглядацца калегіяльна, каб аб'ектыўна падысці да сітуацыі. «Калі чалавек аказваецца ў складанай сітуацыі (праз хваробу або з нейкай іншай прычыны), мы заўсёды гатовыя разгледзець зварот і вырашыць пытанне ў самыя кароткія тэрміны», — паведаміў спецыяліст.

На гэты конт Андрэй Жышкевіч удакладніў пазіцыю фінансістаў наконт банкаўскай спадчыны. Пры пераходзе ўкладу ў разрад спадчыны гэты фактар не будзе аўтаматычна з'яўляцца падставай датэрміновага вяртання безадзыўнога ўкладу. І ў гэтым выпадку ўклад па-ранейшаму будзе безадзыўным, нават калі ён перайшоў да спадчынніка. Больш лагічным выглядае зварот з нагоды зняцця безадзыўнога ўкладу ў выпадку цяжкіх жыццёвых сітуацый. У МТБанку будзе створана камісія (на ўзроўні праўлення банка альбо спецыяльна сфарміраваная), якая зоймецца разглядам падобных зваротаў.

## ДАКЛАДНА ПРА ПАДАТКІ

Даволі шмат пытанняў было ўзнята па тэме будучага спагнання падаходнага падатку. **Намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Беларусі Ірына КРЫВАРУШЧАНКА** адзначыла, што абкладацца падаткам будзе толькі даход у выглядзе працэнтаў па ўкладзе. Сума самога ўкладу, гэта значыць грошай, якія чалавек размесціць на дэпазіце, падаткам не абкладаецца. Каб не было непаразуменняў, яна яшчэ раз спынілася на тых выпадках, калі працэнт па ўкладзе не будзе абкладацца падаткам.

Першы — калі дагавор банкаўскага ўкладу заключаны да 12 лістапада бягучага года. Незалежна ад тэрміну размяшчэння грашовых сродкаў ва ўкладзе альбо пры іх датэрміновым зняцці працэнты, налічаныя ўкладчыку па такім дагаворы, падаткам не абкладаюцца. Другі — калі дагавор заключаны 12 лістапада бягучага года і пазней, але працэнты выплачаныя да 1 красавіка 2016 года. Напрыклад: калі чалавек сёння заключае дагавор банкаўскага ўкладу на тэрмін 3 месяцы (да сакавіка 2016-га), тады працэнты па такім дагаворы будуць вызваляцца ад падатку, бо іх аплата па такім укладзе будзе ажыццяўляцца да 1 красавіка 2016 года.

Трэці выпадак — калі дагавор заключаны пасля 12 лістапада 2015 года і працэнты па ўкладзе налічваюцца ў памеры, які не перавышае працэнт па ўкладзе да запатрабавання. Стаўка па ўкладзе да запатрабавання вызначаецца кожным банкам самастойна. Банкам рэкамендавана не перавышаць максімальны памер працэнтных ставак па ўкладах да запатрабавання ў беларускіх рублях — 3% гадавых, у замежнай валюце — 0,2% гадавых. І апошні, але самы важны выпадак — калі грашовыя сродкі будуць размяшчацца ў доўгатэрміновыя ўклады і фактычна знаходзіцца на банкаўскім рахунку не менш за 1 год у беларускіх рублях і не менш за 2 гады ў замежнай валюце. У гэтых выпадках, незалежна ад памеру працэнтаў па такіх укладах, падатак не будзе ўтрымлівацца. Ва ўсіх астатніх выпадках будзе ажыццяўляцца ўтрыманне падаходнага падатку па стаўцы 13%.

## АШЧАДНЫЯ КАРТКІ ТРАНСФАРМУЮЦЦА Ў РАЗЛІКОВЫЯ

Што чакае ўладальнікаў так званых ашчадных картак, тэрмін дзеяння якіх у асноўным складае больш за год (гаворка ідзе пра карткі ў беларускіх рублях)? Ці будуць абкладацца падаткам працэнты з грошай, якія праляжалі на такім укладзе больш за год? Ілона Лядніцкая лічыць, што на дагаворы, заключаныя сёлета да 12 лістапада, нормы дэкрэта не распаўсюджваюцца. Банкаўскія плацежныя карткі — гэта інструмент доступу да банкаўскага рахунку. Банкаўская картка, у тым ліку так званая ашчадная, можа быць выпушчана да рахунку па ўліку банкаўскага ўкладу (дэпазіту) альбо да бягучага (разліковага) рахунку. Цяпер банкамі змяняецца лінейка дэпазітных прадуктаў з улікам норм Дэкрэта №7. Па бягучых (разліковых) рахунках, у тым ліку тых, доступ да якіх забяспечваецца банкаўскімі плацежнымі карткамі, умовы будуць пераглядацца і працэнтныя стаўкі знізяцца да ўзроўню ставак па банкаўскіх укладах да запатрабавання. Аднак банкамі, вядома, будуць прапанаваны кліентам іншыя ашчадныя прадукты, у тым ліку карткавыя, на аснове тэрміновых укладаў. У гэтым выпадку падаткаабкладанне будзе залежаць ад умоў дагавора банкаўскага ўкладу і фактычнага тэрміну размяшчэння грашовых сродкаў.

Старшыня праўлення МТБанка Андрэй Жыткевіч лічыць, што ўсе банкі будуць кіравацца рэкамендацыямі, якія паступаюць з боку Нацыянальнага банка. Сапраўды, так званыя ашчадныя карткі будуць трансфармавацца ў карткі разліковыя. Камерцыйныя банкі зараз рыхтуюць выпуск разліковай карткі, заснаванай не на матывацыі павышаных працэнтаў, лагічных для тэрміновых укладаў, а матывуюць безнаяўныя разлікі з адпаведнымі бонусамі, якія захаваюцца ў рамках ашчадных картак. З пункту гледжання прадастаўлення кліентам магчымасці атрымліваць і працэнты, калі яны здольныя фіксаваць тэрмін размяшчэння больш як месяц, то тут банкі будуць прапаноўваць разнастайныя дыстанцыйныя формы кіравання астаткам на картках рахунку да запатрабавання з тым, каб чалавек мог аператыўна, не прыходзячы ў банк, пераносіць пэўныя сумы на дэпазітныя рэшткі. Думаю, банкі дадуць пашыраны функцыянал інтэрнэт-банкінгу, які і дазволіць кліентам з ашчаднай карткі, па якой стаўка будзе паніжацца, аператыўна пераразмяркоўваць пэўныя часткі на ашчадныя рахункі ўжо ў выглядзе дэпазітаў.

## А ДАХОДНАСЦЬ ПА ПЕНСІЙНЫХ — ЗНІЗІЦЦА

Калі пенсія прыходзіць на пенсійную картку, ці трэба будзе плаціць падатак? З боку пенсіянераў такіх пытанняў сапраўды шмат.

Прадстаўніца Нацбанка на гэты конт адзначыла, што атрыманне пенсійнай карткі прадугледжвае адкрыццё бягучага банкаўскага рахунку з выпускам персанальнай банкаўскай карткі і, калі гэта прадугледжана дагаворам, — аплату банкам працэнтаў за карыстанне грашовымі сродкамі, якія знаходзяцца на гэтым рахунку. Пры гэтым на дагаворы, якія заключаны да 12 лістапада бягучага года, дзеянне сёмага дэкрэта не распаўсюджваецца, і, адпаведна, падаходны падатак з даходаў у выглядзе працэнтаў па пенсійных рахунках, адкрытых па гэтых дагаворах, утрымлівацца не будзе. Што будзе далей? Як адзначалася, банкі сёння змяняюць свае дэпазітныя прадукты, і працэнтныя стаўкі па бягучых рахунках, у тым ліку пенсійных, паступова будуць вызначаны на ўзроўні ставак па ўкладах да запатрабавання (гэта значыць 3% у беларускіх рублях і 0,2% — у замежнай валюце). Адначасова банкі прапануюць дэпазітныя прадукты, якія дазволяць пенсіянерам ашчаджаць грошы без аплаты падаткаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

■ Дзіцячы адпачынак

# КРУГЛАСУТАЧНАЕ АЗДАРАЎЛЕННЕ

## Пуцёўкі ў дзіцячыя лагеры патаннеюць на 11%

**Больш як 361 тысяча дзяцей адпачылі і аздаравіліся сёлета ў летніках, на што дзяржавай выдаткавана звыш 300 млрд рублёў. У наступным годзе памеры дзяржаўнага фінансавання плануецца павялічыць у межах 11%, паведаміў дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Генадзь БАЛБАТОЎСКІ.**

Са сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання за змяншэнне кошту адной пуцёўкі ў аздараўленчыя і спартыўна-аздараўленчыя летнікі з кругласутачным знаходжаннем прадугледжана 1 млн 400 тыс. рублёў, з дзённым знаходжаннем — 580 тысяч. На не менш як дзевяць дзён кругласутачнага наведвання профільных аздараўленчых летнікаў выдаткоўваецца 600 тыс., у лагеры працы і адпачынку з дзённым знаходжаннем — 650 тысяч.

Летам гэтага года ў Беларусі працавала 6180 аздараўленчых летнікаў: 1553 установы з кругласутачным знаходжаннем дзяцей (у тым ліку 152 стацыянарныя), 4627 — з дзённым знаходжаннем. Наведвальнікі 995 лагераў працы і адпачынку — падлеткі ва ўзросце ад 14 да 18 год — не толькі ўмацавалі здароўе і адпачылі, а і папрацавалі. У лагерах розных тыпаў адпачыла на 5% больш дзяцей, чым планавалася.

Аздараўленне школьнікаў традыцыйна праводзіцца таксама на асенніх, зімовых і вясновых канікулах у лагерах з дзённым знаходжаннем і профільных лагерах.

**Ірына СІДАРОК**

■ Факт

## КАРОВАМІ КІРУЕ КАМП'ЮТАР

**У КСУП «Эксперыментальная база «Пенчын» Буда-Кашалёўскага раёна адкрылася новая малочнатаварная ферма на 600 галоў. Яна стала 18-м аб'ектам малочнай галіны, прынятым у эксплуатацыю з пачатку года на Гомельшчыне. Яшчэ чатыры аналагічныя будоўлі знаходзяцца ў стадыі завяршэння.**

На новай малочнатаварнай ферме, якая знаходзіцца ў вёсцы Пенчын, плануецца выраблядь да 5,5 тысячы тон малака ў год. Асноўныя тэхналагічныя працэсы тут — пад кантролем камп'ютара. Увод дазволіць істотна палепшыць тэхналогію вытворчасці малака і якасць прадукцыі. У новы аб'ект АПК было ўкладзена Br104,2 млрд ільготнага крэдыту Банка развіцця Рэспублікі Беларусь.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ПРАВЕРЫЛІ ГАНДАЛЬ У ПЕРАХОДАХ

**Міністэрства гандлю праверыла некаторыя гандлёвыя аб'екты ў пешаходных пераходах сталічнага метрапалітэна.**

Правяраліся, у прыватнасці, гандлёвыя аб'екты, размешчаныя ў пераходах станцый метро «Кастрычніцкая», «Інстытут культуры», «Акадэмія навук» і «Трактарны завод». Ва ўсіх аб'ектах, чыя праца была прыпынена, выяўлены факты неадпаведнасці патрабаванням заканадаўства і невыканання (да 78%) асартыментных пералікаў тавараў, продаж тавараў са скончанымі тэрмінамі прыдатнасці, неналежнага афармлення або адсутнасці цэннікаў і іншае. Дзейнасць аб'ектаў прыпынена на дзесяць дзён да выпраўлення выяўленых праверкай парушэнняў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# КАТАЛОНСКАЯ МАРА

## Што адбываецца на Пірэнеях?

**Адна з «топавых» міжнародных навін лістапада тычылася Іспаніі. Дакладней, аднаго з яе рэгіёнаў. Інфармагенцтвы паведамілі: большасць дэпутатаў каталонскага парламента ўхвалілі праект рэзалюцыі, у якой гаворыцца, што «Каталонія пачынае працэс стварэння незалежнай дзяржавы ў форме рэспублікі». Прычым гэта павінна адбыцца ўжо ў 2017 годзе.**

У адпаведнасці з прынятым дакументам мяркуецца пачаць працэс выхаду рэгіёна з іспанскага каралеўства. Рэзалюцыю падтрымалі 72 дэпутаты кааліцыі Junts pel Si (Разам за «так») і партыі «Кандыдатура народнага адзінства», якія маюць большасць у парламенце. Сваё рашэнне яны абгрунтавалі вынікамі выбараў 27 верасня, на якіх найбольш месцаў у каталонскім парламенце атрымалі прыхільнікі незалежнасці. Хоць Мадрыд і абвясціў чарговы крок Барселоны неканстытуцыйным, мяркуючы па ўсім, «працэс пайшоў». Ці здолее каралеўства ў перспектыве застацца ў сённяшніх межах? Ці на палітычнай карце Старога Свету замест аўтаномнай вобласці з'явіцца яшчэ адна дзяржава?




### АДМЕТНАЯ ТЭРЫТОРЫЯ

Паводле класіфікацыі гісторыка Менендэса Підаля, Іспанія ўзнікла ў пачатку новага часу ў выніку аб'яднання «пяці каралеўстваў» Пірэнейскага паўвострава — Кастыліі, Арагона (куды ўваходзіла Каталонія), Навары, Партугаліі і Гранады. З іх толькі Партугалія пасля дамаглася незалежнасці ад Мадрыда. Спецыялісты сцвярджаюць, што апошні раз незалежнай дзяржавай Каталонія была ў XII стагоддзі — тады яна ўвайшла ў склад больш магутнага каралеўства Арагон. А ў 1492 годзе і само каралеўства (у выніку шлюбу Фердынанда Арагонскага і Ізабэлы Кастыльскай) страціла сваю незалежнасць. Цэнтр палітычнага жыцця перамясціўся ў Мадрыд, а Каталонія ва ўсіх сэнсах апынулася на перыферыі.

Але гэта не значыць, што імкненне да рэгіянальнага самавызначэння знікла. Так ці інакш, але канфлікт паміж Барселонай і Мадрыдам існаваў на працягу амаль усёй гісторыі Іспаніі, абвастраючыся ў моманты палітычных крызісаў, рэвалюцый і грамадзянскіх войнаў. У XVII стагоддзі барселонскае дваранства і частка буржуазіі арыентаваліся на Францыю, спадзеючыся такім чынам захаваць свае вольнасці і прывілеі. Падчас вайны за іспанскую спадчыну Барселона наадварот падтрымала Габсбургаў супраць французскіх Бурбонаў. Прайграючы ў гэтых канфліктах, Каталонія паступова губляла свой адметны статус у іспанскай манархіі, пакуль не дэградавала да пасрэднай правінцыі.

**Згодна з апошнім апытаннем грамадскай думкі, колькасць прыхільнікаў незалежнасці і захавання Каталоніі ў складзе Іспаніі практычна аднолькавая — каля 46-48%.**

Толькі падчас Другой рэспублікі ў 1932-м Каталонія (разам з Краінай Баскаў, яшчэ адным рэгіёнам са сваімі адметнымі культурай і мовай) атрымала аўтаномію. Менавіта тады тут быў створаны свой урад — Жэнералітат. Як вынік, у грамадзянскай вайне 1936—1939 гадоў каталонцы ваявалі супраць Франка. Індустрыйна развітая Барселона стала апірышчам рэспубліканцаў з прычын, хутчэй, сацыяльных: менавіта тут была засяроджана значная частка працоўнага класа, што арыентаваўся на сацыялістаў, анархістаў і нават трацкістаў. Аднак пасля перамогі рэжым генералісімуса Франка пакараў нелаяльную тэрыторыю новай хваляй рэпрэсій. Прычым гэта датычылася не толькі мясцовага самакіравання, але і тутэйшых культурных інстытутаў. Каталанская мова фактычна апынулася пад забаронай. На ёй было забаронена друкаваць кнігі, а выкладанне было пераведзена поўнасцю на іспанскую. І хоць да канца франкісцкай эпохі гэтыя абмежаванні былі спачатку змякчаны, а потым скасаваны, мясцовая інтэлігенцыя добра запомніла, як з ёй абышоўся федэральны цэнтр.

«Многія каталонцы і цяпер лічаць, што яны — прадстаўнікі асобнай нацыі, якая адрозніваецца ад астатніх іспанцаў. Гэта адчуванне падмацоўваецца ўспамінамі пра дыктатуру Франка, які спрабаваў знішчыць каталонскую мову і культуру», — заўважае прафесар літаратуры Барселонскага ўніверсітэта Жордзі Гарсія.

### ПРАВА НА АЎТАНОМІЮ

У 1979 годзе Каталонія атрымала аўтаномны статус, з якога вынікае і афіцыйнае прызнанне каталанскай мовы. З гэтага моманту тутэйшы Жэнералітат уваходзіць у іспанскую дзяржаўную сістэму канстытуцыйнай манархіі. Урад з рэзідэнцыяй у Барселоне лічыцца пераемнікам улады картэсаў — саслоўна-прадстаўніцкіх сходаў. Ён складаецца з парламента са 135 дэпутатамі і Выканаўчай Рады. Старшыня Жэнералітата аўтаномнай вобласці Каталоніі абіраецца парламентам на 4 гады. У 2006 годзе (калі цэнтральны ўрад Іспаніі фарміравалі сацыялісты на чале з Хасэ Луісам Радрыгесам Сапатэра) быў зацверджаны пашыраны аўтаномны статус Каталоніі, які ў тым ліку прадугледжваў пашырэнне фінансавай самастойнасці. Аднак сённяшні кансерватыўны ўрад Марыяна Рахоя гэтыя паслабленні часткова скасаваў. У 2010 годзе Канстытуцыйны суд Іспаніі прызнаў незаконнымі канцэпцыю «каталонскай нацыі», прыярытэт каталанскай мовы і пашыраныя фінансавыя і судовыя паўнамоцтвы Каталоніі.

Асаблівае раздражненне ў Каталоніі выклікае Народная партыя, што захоўвае франкісцкі лозунг «адзінай і непадзельнай» Іспаніі. У Каталоніі за Народную партыю, заснаваную палітычнымі паслядоўнікамі Франка, галасуе толькі 8,5% выбаршчыкаў, што пазбаўляе яе заўважнага ўплыву ў рэгіёне. Значна большай папулярнасцю карыстаецца Іспанская сацыялістычная працоўная партыя, якая яшчэ з часоў грамадзянскай вайны 1936—1939 гадоў падтрымлівае права нацыянальных аўтаномій, тых жа каталонцаў, а таксама баскаў.



### ЛАКАМАТЫЎ ЭКАНОМІКІ

Якія аб'ектыўныя перадумовы для стварэння новай дзяржавы на Пірэнеях? Прычыны імкнення да незалежнасці варта ў першую чаргу шукаць у эканоміцы. З гэтага пункту гледжання Каталонія адносіцца да найбольш развітых раёнаў Іспаніі. Насельніцтва аўтаноміі складае каля 16% усяго паказчыка дзяржавы, але тут вырабляюць больш чым пятую частку валавога нацыянальнага прадукту. ВУП Каталоніі такі ж, як у Фінляндыі і Даніі, і вышэйшы, чым у Ірландыі. Узровень экспарту набліжаецца да паказчыкаў Фінляндыі і перавышае вынікі Партугаліі. Эканамічны рост Каталоніі адзін з самых дынамічных у Старым Свеце. Гэта прамысловы рэгіён, дзе размешчаны такія галіны, як тэкстыльная (каля 80% яе вытворчых магутнасцяў засяроджана ў трохкутніку паміж гарадамі Барселона, Тэраса, Сабадэль), хімічная, фармацэўтычная і аўтамабілебудаўнічая прамысловасць. Асноўная галіна эканомікі рэгіёна, які практычна не мае карысных выкапняў, ужо не сельская гаспадарка, дзе занята толькі 2% працаздольнага насельніцтва, а прамысловасць — 25% і, галоўнае, сфера паслуг — занята 64% працаздольных.



Прыхільнікі каталонскай незалежнасці жартуюць: «Калі адлучыць Каталонію ад Іспаніі, атрымаецца Паўднёвая Швейцарыя, а астатняя Іспанія ператворыцца ў Афрыку». Прычым, як ва ўсялякім жарце, тут ёсць доля ісціны: як сцвярджаюць спецыялісты, многія сферы каталонскага бізнесу нават не заўважылі крызісу 2008 года. Барселона — ключавы гандлёвы порт Міжземнамор'я. На каталонскіх заводах збіраюцца аўтамабілі Audi і Nissan, добра развіта мясцовая металургічная прамысловасць. Прадукцыя каталонскіх мяса-малочных камбінатаў разыходзіцца па ўсім свеце. У рэгіёне функцыянуюць дзве атамныя электрастанцыі — «Вандэльёс» і «Аско», шмат індустрыйных паркаў, асабліва ў раёне Коста-Дарада. Валавы ўнутраны прадукт у разліку на душу насельніцтва аўтаноміі перавышае сярэдні паказчык па Іспаніі. Гэта практычна ўзровень Германіі і вышэй, чым у Грэцыі і Партугаліі. Такім чынам, Каталонія, без перабольшвання, сапраўдны лакаматыў іспанскай эканомікі.

### «БАРСА» ЦІ «РЭАЛ»?

Нягледзячы на аўтаномію, многія жыхары рэгіёна незадаволены тым, што Каталонія застаецца донарам для астатняй Іспаніі. Па ацэнках рэгіянальных улад, штогод у выглядзе трансфераў у Мадрыд (а адтуль — у іншыя рэгіёны) паступае эквівалентна 6,5—8,5% ВУП Каталоніі. «Сродкі, якія пералічваюцца Мадрыду, накіроўваюцца пераважна ў бедныя рэгіёны на поўдні і на захадзе. У выніку Каталонія і іншыя рэгіёны-донары не атрымліваюць дастатковых інвестыцый. Гэта было менш адчувальна падчас хуткага эканамічнага росту, аднак падчас крызісу стварае вялікія праблемы для рэгіёна», — лічыць эканаміст банка La Caixa Мануэла Ракафорт. Каталонія хацела б атрымаць тыя ж правы, што і Краіна Баскаў, якая сама збірае мясцовыя падаткі і кантралюе тое, як яны выкарыстоўваюцца.

Прыхільнікі незалежнасці Каталоніі вылучаюць не толькі фінансавыя, але і культурныя патрабаванні. У прыватнасці, яны патрабуюць скасаваць закон 2012 года, паводле якога навучанне ў школах вядзецца на іспанскай мове. Сапраўды, Міністэрства адукацыі ў Мадрыдзе неаднаразова заклікала «іспанізаваць» маладых каталонцаў. Гэта нагадала многім тутэйшым жыхарам пра часы франкізму і спробы знішчыць іх ідэнтычнасць.

Цікавыя вынікі сацыялагічных даследаванняў. Згодна з апошнім апытаннем грамадскай думкі, колькасць прыхільнікаў незалежнасці і захавання Каталоніі ў складзе Іспаніі практычна аднолькавая — каля 46-48%. Гэта, як лічаць назіральнікі, стварае патавую сітуацыю. Аднак заўважная тэндэнцыя росту колькасці прыхільнікаў незалежнасці, яна ўзмацнілася сёлета на фоне канфлікту каталонскага парламента і Мадрыда.

Каталонцы не вераць, што цэнтральны ўрад прыслухаецца да іх патрабаванняў ці пойдзе на паглыблены дыялог. Аднавіць давер вельмі складана: як прэм'ер-міністр Марыяна Рахой, так і кіраўнік Жэнералітата Каталоніі Артур Мас занялі цвёрдую пазіцыю і не гатовы ісці на саступкі. У іспанскай прэсе пішуць нават пра асабістую палітычную дуэль Рахоя і Маса, кожны з якіх баіцца «згубіць твар».

У адказ на запыт цэнтральнага ўрада каралеўства Канстытуцыйны суд Іспаніі прыпыніў дзеянне рэзалюцыі парламента Каталоніі пра «пачатак працэсу стварэння незалежнай дзяржавы з рэспубліканскай формай кіравання». Да вынясення канчатковага вердыкту суддзяў любыя дзеянні прыхільнікаў незалежнасці аўтаноміі будуць лічыцца незаконнымі. Зрэшты, перасцярогі судовай улады пакуль іх не спынілі. Як заявілі прадстаўнікі кааліцыйных партый, яны маюць намер працягнуць ажыццяўленне плана, у адпаведнасці з якім цягам найбліжэйшых 18 месяцаў будуць сфарміраваны дзяржструктуры і распрацавана канстытуцыя Каталоніі.

І апошняе. Лічыцца, што спорт па-за палітыкай. Гэта не зусім так. Флагман еўрапейскага футбола «Барселона» была адлюстраваннем той жа каталонскай мары цягам усяго свайго існавання. Напрыклад, падчас франкісцкай дыктатуры падтрымка «Барсы» аб'ядноўвала прыхільнікаў незалежнасці. Стадыён заставаўся адзіным публічным месцам, дзе дазвалялася гаварыць па-каталанску. Саперніцтва двух галоўных клубаў Іспаніі — «Барсы» і мадрыдскага «Рэала» — набыло сімвалічную афарбоўку. У чымсьці так застаецца і дагэтуль. Дарэчы, днямі на мадрыдскім стадыёне «Сант'яга Бернабеу» «Барселона» ўшчэнт разграміла «Рэал» — 4:0.

**Мікалай МІКАЛАЕЎ.**

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703** |
| Продавец | **ОАО «СТАНКОСТРОИТЕЛЬНЫЙ ЗАВОД им. С.М. КИРОВА», г. Минск, ул. Красноармейская, д. 21** |

**Предмет аукциона (производственная база, расположенная по адресу: г. Минск, ул. Красноармейская, д. 21)**

| Наименование | Инвентарный номер | Общая площадь, кв.м | Назначение |
|---|---|---|---|
| **Производственный корпус с АБК** | 500/С-42862 | 30438,2 | Здание специализированное для металлургического производства и металлообработки |
| <u>Составные части и принадлежности:</u> площадки складирования отходов, площадка под склад готовой продукции, площадка под склад заготовок, площадка под склад металла с путями под козловой кран, площадка под памятник, проезд, площадки, дорожки, крыльца, цветник, ограждения (10 шт.), ворота (5 шт.), калитка | | | |
| **Здание складов** | 500/С-46903 | 192,6 | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ |
| **Склад ООМиК** | 500/С-53656 | 59,4 | |
| **Механический цех №12** | 500/С-46879 | 2658,8 | Здание специализированное для производства машин и оборудования (машиностроения) |
| **Теплопункт** | 500/С-46881 | 722,8 | Здание неустановленного назначения |
| **Весовая** | 500/С-62782 | 8,6 | |
| **Проходная** | 500/С-53657 | 9,2 | |

В состав предмета аукциона входят **многолетние насаждения** (деревья 46 шт., кустарники 153 шт., цветники 30 кв.м, газоны и напочвенные покровы 5 202 кв.м) и **передаточные устройства** (линия э/снабжения цеха № 12 (инв. № 20003-2), линия э/передачи кабельная (инв. № 2010), линия э/передачи кабельная ЛЭП КВ (инв. № 2009-2), освещение наружное 220В (инв. № 2007), канализация ливневая (к главному корпусу) (инв. № 2024), канализация производственно-фекальная (инв. № 2023), канализация (главный корпус) (инв. № 22006), водопровод горячее водоснабжение, главный корпус) (инв. № 2019), водопровод к новому корпусу (инв. № 2025), трубопровод сжатого воздуха внутри главного корпуса (инв. № 4311), теплотрасса до ТК-16 (инв. № 22007), теплосеть (главный корпус) (инв. № 22008), теплотрасса с дренажной насосной станцией № 30 (инв. № 220013), связь телефонная (инв. № 2008)

**Начальная цена с НДС 20% – 232 957 446 000 белорусских рублей**

**Сведения о земельном участке**: предоставлен продавцу для обслуживания зданий и сооружений производственной базы на праве временного пользования пл. **5.2336 га (**срок действия по 31.07.2020). **Ограничения** прав на земельный участок: расположен в водоохранной зоне.
В соответствии с генеральным планом г. Минска здания и сооружения, расположенные по ул. Красноармейская, д. 21, размещены в зоне общественной застройки и в перспективе подлежат сносу

**Обременения:** площади зданий частично сданы в аренду. Более подробную информацию по арендаторам можно узнать у организатора аукциона

**Задаток 1%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYR) перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки».

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **20** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **28.12.2015 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **25.12.2015 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by** |

Открытое акционерное общество

## «Дорожно-транспортный трест № 3»

**сообщает о проведении внеочередного собрания акционеров, которое состоится 3 декабря 2015 года в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. О принятии новой редакции Уставов открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест № 3».

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет проводиться 03.12.2015 г. с 10.00 до 10.45 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, — 30.11.2015 г.

Лицам, имеющим право на участие в собрании, можно ознакомиться с материалами к собранию с 26 ноября 2015 года по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 40.

Лицам, имеющим право на участие в собрании, при себе иметь документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров — доверенности, зарегистрированные в соответствии с действующим законодательством).

Справки по телефонам: 28-40-20, 23-64-24 — ОЭАиП, Наблюдательный совет.

УНП 700049607

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА

**Организатор аукциона:** Государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, тел. (0212) 42-61-62

| Предмет аукциона, кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение, срок аренды земельного участка |
|---|
| Лот №1. Право заключения договора аренды сроком на 10 лет земельного участка с кадастровым №221850100001003671, площадью 0,0100 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, г. Городок, ул. Карла Маркса, вблизи многоквартирного жилого дома №68 для строительства и обслуживания объекта розничной торговли – специализированного магазина по торговле цветами (павильон модульного типа) (1 16 03 размещение объектов розничной торговли). Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: зона охраны недвижимых материальных историко-культурных ценностей. **Начальная цена** права заключения договора аренды: 3 770 200 бел. руб. **Размер задатка:** 377 000 бел. руб. |
| Дата, время и место проведения аукциона: **29.12.2015 в 15.00** по адресу: г. Городок, ул. Пролетарская, 2 в Городокском райисполкоме. Срок внесения задатка и приема документов: с **24.11.2015 с 8.30 по 28.12.2015 до 17.30** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в рабочие дни с 8.30 до 17.30 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600316007107 в ф-ле №200 Витебского облуправления ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 150801635, УНП 300594330, код платежа 04002. Получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области. |

Аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462. **Победитель аукциона (единственный участник несостоявшегося аукциона) обязан (условия аукциона):** в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона, либо признания аукциона аренды несостоявшимся внести плату за право заключения договора аренды зем. участка, возместить расходы, связанные с проведением аукциона и формированием зем. участка, в т.ч. с гос. регистрацией в отношении создания зем. участка; в течение 2 рабочих дней заключить с райисполкомом договор аренды зем. участка; в течение 2 месяцев со дня заключения договора аренды обратиться за гос. регистрацией возникновения права на зем. участок, ограничений (обремений) прав в его использовании; в течение 6 месяцев со дня гос. регистрации возникновения права на зем. участок приступить к занятию данного участка; разработать, согласовать и утвердить проектную документацию на строительство объекта и подключение его к инженерным коммуникациям; получить разрешение на строительство объекта; перед началом строительства снять из под пятен застройки плодородный слой почвы и использовать его на устройство газона равновеликой площадью на землях общего пользования г. Городок в месте (местах) по согласованию с КУПП Городокского р-на «Городокское предприятие котельных и тепловых сетей»; обеспечить соблюдение обязанностей землепользователей (арендаторов) зем. участков; не позднее чем за 3 месяца до истечения срока действия договора аренды письменно уведомить арендодателя о намерении заключить договор аренды на новый срок или по истечению срока действия договора возвратить зем. участок арендодателю в состоянии, пригодном для использования его в качестве земель общего пользования. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Для участия в аукционе граждане, индивидуальные предприниматели, консолидированные участники (двое и более граждан, индивидуальных предпринимателей, юр. лиц) и юр. лица лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо в установленный срок подают заявление на участие в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих гос. регистрацию юр. лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; представителем иностранного юр. лица – легализованные копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык, легализованные доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о фин. состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного гражданина – легализованная доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; консолидированными участниками представляются оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов предъявляется документ, удостоверяющий личность. Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности земельного участка. **Конт. тел.: (0212)42-61-62, (029)510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Слуцкий пивоваренный завод» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже одним лотом имущества:**

**здание административного корпуса, общ. пл. 2168.9 кв.м (инв. № 640/С-27293); весовая, общ. пл. 25.8 кв.м (инв. № 640/С-27303); переходная галерея, общ. пл. 65 кв.м (инв. № 640/С-27304); элеватор, общ. пл. 1414.3 кв.м (инв. № 640/С-27309); главный производственный корпус, общ. пл. 12370 кв.м (инв. № 640/С-27312); проходная, общ. пл. 30.8 кв.м (инв. № 640/С-27313); незавершенное законсервированное капитальное строение, общ. пл. 440.2 кв.м (инв. № 640/U-72996); оборудование элеватора** на земельном участке, площадью **3.1450 га** по адресу: г. Слуцк, ул. Тутаринова, 1.

**Начальная цена без НДС – 9 055 435 600 бел. руб. (*<u>стоимость снижена на 50%</u>*).**

**Задаток 10% от начальной цены (905 543 000 бел. руб.), перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

*Предыдущие извещения о проведении торгов опубликованы в газете «Звязда» от 31.10.2015.*

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **04.12.2015 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **03.12.2015 до 16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224-61-34, (8029) 102-21-17.**

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703** |
| Продавец | **Минское районное потребительское общество, г. Минск, ул. Бровки, 24** |

**Предмет аукциона**

| № лота | Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|---|
| Лот 1 | Магазин №39 | Здание специализированное розничной торговли | 137,7 кв.м | 600/С-139782 | Минская обл., Минский р-н, Роговский с/с, д. Головачи, 2А |
| **Сведения о земельном участке** | пл. **0,2038 га** предоставлен продавцу на праве аренды сроком по 18.09.2032 для обслуживания здания магазина | | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 130 000 000 белорусских рублей** | | | | | |
| Лот 2 | Магазин № 63 | Здание специализированное розничной торговли | 97,7 кв.м | 600/С-136917 | Минская обл., Минский р-н, Горанский с/с, д. Великое Село |
| **Сведения о земельном участке** | пл. **0,0768 га**, предоставлен продавцу на праве аренды по 06.12.2041 для обслуживания здания магазина с ограничением (водоохранная зона) | | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 152 000 000 белорусских рублей.** | | | | | |

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также оплаты вознаграждения и возмещения затрат за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

*Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 04.11.2015 г.*

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **10.12.2015 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **08.12.2015 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные данные** | **Тел. +375-17-280-36-37, +375-29-183-69-71. auction@cpo.by. www.cpo.by** |

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже изолированных помещений, принадлежащих ОАО «ГИАП»

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Лот № 1** | Изолированное помещение с инв. № 700/D-126431. Назначение – административное помещение. Площадь – 414,9 кв.м. Г.п. – 1982. Этаж – 1 | Могилевская обл., г. Могилев, ул. Гагарина, 52А-3 | **Начальная цена с НДС, бел. руб.** 5 175 738 211 | **Задаток, бел. руб.** 200 000 000 |
| **Лот № 2** | Изолированное помещение с инв. № 700/D-126432. Назначение – административное помещение. Площадь – 542,8 кв.м. Г.п. – 1982. Этаж – 3 | Могилевская обл., г. Могилев, ул. Гагарина, 52А-4 | **Начальная цена с НДС, бел. руб.** 5 243 802 901 | **Задаток, бел. руб.** 200 000 000 |
| **Лот № 3** | Изолированное помещение с инв. № 700/D-126434. Назначение – административное помещение. Площадь – 554,5 кв.м. Г.п. – 1982. Этаж – 4 | Могилевская обл., г. Могилев, ул. Гагарина, 52А-5 | **Начальная цена с НДС, бел. руб.** 5 405 648 669 | **Задаток, бел. руб.** 200 000 000 |
| **Лот № 4** | Изолированное помещение с инв. № 700/D-126435. Назначение – административное помещение. Площадь – 553,2 кв.м. Г.п. – 1982. Этаж – 5 | Могилевская обл., г. Могилев, ул. Гагарина, 52А-6 | **Начальная цена с НДС, бел. руб.** 5 523 564 876 | **Задаток, бел. руб.** 200 000 000 |
| **Лот № 5** | Изолированное помещение с инв. № 700/D-126436. Назначение – складское помещение. Площадь – 160,1 кв.м. Г.п. – 1982. Этаж – подвал | Могилевская обл., г. Могилев, ул. Гагарина, 52А-7 | **Начальная цена с НДС, бел. руб.** 1 327 134 524 | **Задаток, бел. руб.** 70 000 000 |
| **Лот № 6** | Изолированное помещение с инв. № 700/D-126440. Назначение – производственное помещение. Площадь – 20,8 кв.м. Г.п. – 1982. Этаж – подвал | Могилевская обл., г. Могилев, ул. Гагарина, 52А-8 | **Начальная цена с НДС, бел. руб.** 175 718 258 | **Задаток, бел. руб.** 10 000 000 |
| **Лот № 7** | Изолированное помещение с инв. № 700/D-126442. Назначение – помещение связи. Площадь – 7,6 кв.м. Г.п. – 1982. Этаж – техэтаж | Могилевская обл., г. Могилев, ул. Гагарина, 52А-9 | **Начальная цена с НДС, бел. руб.** 82 337 802 | **Задаток, бел. руб.** 4 000 000 |

Капитальное строение, в котором расположены изолированные помещения, находится на земельном участке площадью 0,3095 га с кадастровым номером 740100000005000013

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Лот (Лоты) по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен подписать с Продавцом договор купли-продажи в течение 15 (пятнадцати) дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Условия оплаты приобретенного на аукционе Лота (Лотов) согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при подписании договора купли-продажи.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 1% (одного процента) от цены продажи Лота №1 и (или) Лота №2 и (или) Лота №3 и (или) Лота №4 и (или) 3% (три процента) от цены продажи Лота №5 и (или) 5% (пять процентов) от цены продажи Лота №6 и (или) 8% (восемь процентов) от цены продажи Лота №7 в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) возмещает Продавцу стоимость затрат на рыночную оценку в размере:
- 4 772 460 (Четыре миллиона семьсот семьдесят две тысячи четыреста шестьдесят) белорусских рублей при приобретении Лота №1;
- 4 835 221 (Четыре миллиона восемьсот тридцать пять тысяч двести двадцать один) белорусский рубль при приобретении Лота №2;
- 4 984 456 (Четыре миллиона девятьсот восемьдесят четыре тысячи четыреста пятьдесят шесть) белорусских рублей при приобретении Лота №3;
- 5 093 184 (Пять миллионов девяносто три тысячи сто восемьдесят четыре) белорусских рубля при приобретении Лота №4;
- 1 223 728 (Один миллион двести двадцать три тысячи семьсот двадцать восемь) белорусских рублей при приобретении Лота №5;
- 162 027 (Сто шестьдесят две тысячи двадцать семь) белорусских рублей при приобретении Лота №6;
- 75 922 (Семьдесят пять тысяч девятьсот двадцать два) белорусских рубля при приобретении Лота №7.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 28.12.2015 в 11.30 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5%**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона **ino.by**.

*Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже изолированных помещений ОАО «ГИАП» (Лот № __),* **проводимом 28 декабря 2015 г.**

Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 6. Окончание приема заявлений – **23.12.2015 в 12.00.**

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом (Объектами). Контактное лицо для осмотра Объекта (Объектов): Кашлевский Юрий Витальевич, 8 (029) 882-91-58, 8 (0222) 47-75-71.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот (лоты) с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

# КАРАНІ І КРОНЫ

7

Сумесны выпуск газеты «Звязда» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя №6


# АБ ЧЫМ ГУДЗЕ ВЕЧНАЯ ПРАЦАЎНІЦА?

## РАТУЕМ ПЧОЛ



Фота Анатоля ДРЫБАСА.

**Праз 20 гадоў пчолы могуць знікнуць з твару зямлі — такая навіна нядаўна ўскалыхнула прасторы інтэрнэту. Па звестках расійскіх пчаляроў, толькі з пачатку XXI стагоддзя колькасць гэтых насякомых у Расіі скарацілася ў тры разы. Прыкладна такая ж сітуацыя назіраецца і ў іншых краінах Еўропы і свету. І калі не прымаць ніякіх захадаў, усяго праз два дзесяцігоддзі пчол на планеце можа наогул не застацца.**

**Ці спраўдзяцца гэтыя неспрыяльныя прагнозы? Якія фактары ўплываюць на дабрабыт пчаліных сем'яў ва ўсім свеце і Беларусі ў прыватнасці? Мы пацікавіліся ў навукоўцаў, спецыялістаў-аграрыяў і саміх пчаляроў.**

### Нашы пчолы насамрэч не нашы

На тэрыторыі сучаснай Беларусі яшчэ 100—200 гадоў таму жыла сярэдняруская (або еўрапейская цёмная) меданосная пчала (лац. Apis mellifera mellifera). Сёння як парода яна не існуе ў нашай прыродзе. З-за агрэсіўнасці пчаляры не любілі мясцовых пчол. Таму сталі заводзіць замежныя расы — каўказянку, краінку (карніку), італьянку, а таксама розныя лініі гэтых парод. Спароўваючыся паміж сабой у прыродзе, мясцовыя і завозныя расы паступова звялі на нішто папуляцыю сярэднярускіх пчол.

Па словах **Алега ПРЫШЧЭПЧЫКА, старшага навуковага супрацоўніка лабараторыі наземных беспазваночных жывёл НПЦ НАН Беларусі па біярэсурсах,** пчолы, якія жывуць сёння ў Беларусі, марфалагічна, фізіялагічна не прыстасаваны да нашых прыродных умоў. Ім патрэбна больш вільготная або цёплая зіма, іншыя батанічныя сямейства раслін. Яны не могуць выжыць без дапамогі чалавека. Таму свабодныя раі дрэнна зімуюць, яны часта гінуць або становяцца малалікімі. З-за неспрыяльных зімовых тэмператур, недахопу корму і хвароб узнікаюць праблемы і на пчальніках.

### Калапс пчалінай сям'і

Але ў апошні час знікненне і гібель пчол пачалі развівацца сур'ёзнымі тэмпамі ва ўсім свеце. Так, у 2004—2005 гадах у Іспаніі вымерла 40% пчалінага «пагалоўя», у 2006—2008 гадах у Японіі загінула каля 25% пчаліных сем'яў. Зіма 2007—2008 гадоў стала сур'ёзным выпрабаваннем для многіх пчаляроў свету: у асобных раёнах на поўдні Германіі загінула да 80% пчол, а ў Канадзе — 27%; амаль на 40% скарацілася колькасць пчол у Расіі і на 50% — у Італіі. У 2009 годзе траціна пчол у ЗША таксама не перажыла зіму. У Беларусі гэтая праблема ўпершыню масава праявілася ў 2002 годзе, калі па непацверджаных звестках загінулі прыкладна дзве траціны пчаліных сем'яў у краіне.

Гэты феномен атрымаў назву «асенні злёт» ці «калапс пчаліных сем'яў». Так, позняй восенню цалкам падрыхтаваная да зімы сям'я падчас чарговага агляду або кантролю часам аказваецца абсалютна без пчол або з невялікай жменяй насякомых, якія відавочна не дажывуць да вясны.

Сёння навукоўцы і пчаляры ўсяго свету спрабуюць вызначыць прычыны гэтага феномену. Версіі вылучаюцца розныя — пачынаючы ад амаль фантастычных (уплыў базавых станцый мабільнай сувязі або слабых ліній электраперадач), заканчваючы больш абгрунтаванымі навукай.

### Клешч-шкоднік

Найбольш верагоднай прычынай знікнення пчол навукоўцы называюць вараатоз — хваробу, якая выклікаецца кляшчом вараа, што з сярэдзіны мінулага стагоддзя пачаў распаўсюджвацца з Індыі па ўсім свеце.

Па словах **Дзмітрыя РАХМАТУЛІНА, кіраўніка лабараторыі пчалярства Інстытута пладаводства,** упершыню пра гэтую хваробу ў нашай краіне загаварылі ў 1978 годзе. За апошні час яна моцна эвалюцыянавала і працягвае ўдасканальвацца. Эфектыўнасць прэпаратаў супраць гэтага захворвання падае з кожным годам, бо ў кляшчоў выпрацоўваецца да іх імунітэт.

Вірусы, якія перадаюцца пчолам з кляшчамі, а іх налічваецца каля 20, — сур'ёзная праблема для развіцця пчалярства. Яны глыбока пранікаюць у арганізм насякомага, пашкоджваючы ўсе яго сістэмы, у тым ліку і выклікаючы такія неадэкватныя паводзіны, як пакіданне вулля сям'ёй.

— Гэтая з'ява цалкам падкантрольная пчалярам, — кажа **Васіль КАВАЛЕЦ, старшыня салігорскага міжраённага грамадскага аб'яднання пчаляроў «Бортнік».** — Трэба толькі карыстацца якаснымі ветэрынарнымі прэпаратамі, выконваць ратацыю прэпаратаў па гадах, каб пазбегнуць прывыкання да іх кляшча. На жаль, не ўсе пчаляры выконваюць рэкамендацыі па падрыхтоўцы пчол да зімоўкі, у тым ліку і барацьбе з кляшчом, што і становіцца прычынай злёту.

### Чым лячыць будзем?

Адсутнасць якасных прэпаратаў для лячэння пчол — яшчэ адна важная праблема. Па словах Дзмітрыя Рахматуліна, лекі ад вараатозу ў нашай краіне не выпускаюцца. Прэпараты з Еўропы часта недаступныя па цане беларускім пчалярам, а расійскія не заўсёды адпавядаюць заяўленым якасцям. Таму пчолы часта гінуць ад спадарожных хвароб, выкліканых кляшчом.

**(Заканчэнне на 8-й стар.)**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ На слыху

## Калі ў нас з'явяцца «зялёныя» прадукты?

# ЗАКОН ДЛЯ «АРГАНІКІ»

**Усё часцей даводзіцца чуць, што з-за інтэнсіўнай сельскай гаспадаркі, якая стараецца накарміць чалавецтва, дэградуюць глебы. Альтэрнатывай традыцыйнаму земляробству лічыцца арганічная сельская гаспадарка. Пры вырошчванні прадуктаў па гэтай тэхналогіі не выкарыстоўваюцца пестыцыды, гербіцыды, у саміх прадуктах адсутнічаюць харчовыя дабаўкі. Спецыялісты прызнаюць: такі від гаспадаркі зніжае нагрузку на зямлі і, адпаведна, негатыўны ўплыў на клімат. Праўда, пакуль яна не карыстаецца папулярнасцю: па словах галоўнага агранома аддзела аграхіміі і аховы раслін Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Міхаіла АРЛОВА, у свеце менш за 1% сельскагаспадарчых земляў выкарыстоўваецца пад такі від земляробства. Але з году ў год колькасць «зялёных» гаспадарак павялічваецца.**



**Намеснік міністра Мінсельгасхарчу Уладзімір ГРАКУН** запэўнівае, што ў нашай краіне маюцца добрыя напрацоўкі — напрыклад, распрацавана тэхналогія вырошчвання бахчавых культур. Ужо больш за мільён га земляў знаходзіцца ў карыстанні фермераў, арганічным земляробствам займаюцца ў 14 гаспадарках. Праводзяцца вучэбныя курсы па арганічнай сельскай гаспадарцы, працуюць чатыры сертыфікацыйныя кампаніі.

Аднак прадаваць сертыфікаваную «зялёную» прадукцыю немагчыма, пакуль у Беларусі няма адпаведнага закона. На III Міжнароднай канферэнцыі па арганічнай сельскай гаспадарцы, якая нядаўна адбылася ў Мінску, спецыялісты абмеркавалі канцэпцыю будучага закона аб арганічнай сельскай гаспадарцы, якая ўжо падрыхтавана Мінсельгасхарчам і знаходзіцца на абмеркаванні ў парламенце. Да пачатку 2017 года дакумент мусіць быць прыняты.

— Беларускае заканадаўства па арганічнай сельскай гаспадарцы мусіць быць узгоднена з еўрапейскім, гэта дазволіць вашай прадукцыі выйсці на еўрапейскі рынак, — упэўнена **кіраўнік праекта «Тэхнічная дапамога для падтрымкі развіцця «зялёнай» эканомікі ў Беларусі» Надзя БОНЕВА.** — У рамках праекта «зялёнай эканомікі» міжнародны эксперт арганізацыі Human Dynamics Вяра Стэфанава падрыхтуе аналіз заканадаўства ў дзвюх краінах Еўрасаюза, а пасля дасць рэкамендацыі па адаптацыі вашага законапраекта. Яны будуць гатовы ў сакавіку наступнага года. Акрамя таго, спецыялісты дадуць заўвагі па экалагічнай маркіроўцы і сертыфікацыі прадукцыі.

Міжнародныя эксперты раяць выбраць кампетэнтны орган для развіцця сектара арганічнай сельскай гаспадаркі, напрыклад Мінсельгасхарч. У ім мусіць з'явіцца асобнае падраздзяленне па гэтым напрамку. Для далейшага прасоўвання арганічнай сельскай гаспадаркі трэба мець сістэму кантролю і рэестр фермераў, вытворцаў, прадаўцоў, кантрольных органаў.

Іншае пытанне, якое ўзнікае наконт арганічнай прадукцыі, — яе рэалізацыя. Не сакрэт, што ў Германіі спажыўцы «пераплочваюць» за арганічныя прадукты на 20% і, хоць набываюць менш, затое ўпэўнены ў якасці і экалагічнасці. Вынікі сацыялагічных даследаванняў паказваюць: больш за палову беларусаў гатовы набываць арганічную прадукцыю па больш высокіх цэнах.

**Міністр прыродных рэсурсаў і аховы наваколля Андрэй КАЎХУТА** адзначае:

— Вядома, арганічныя прадукты будуць даражэйшымі за звычайныя. Аднак добрая якасць мусіць забяспечыць запатрабаванасць гэтай прадукцыі.

**Кацярына РАДЗЮК**

*radziuk@zviazda.by*

■

# АБ ЧЫМ ГУДЗЕ ВЕЧНАЯ ПРАЦАЎНІЦА?


Фота Віктара КАЗЛОЎСКАГА.

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Акрамя таго, у краіне практычна адсутнічае сістэмнае ветэрынарнае абслугоўванне. Але, на думку Васіля Кавальца, з лячэннем хвароб здольныя справіцца і самі пчаляры, дапамога ветэрынарнай службы неабходна для абследавання пчаліных сем'яў і якаснай дыягностыкі іх захворванняў.

## Хімія на паражэнне

У апошнія гады ўзрос узровень хімізацыі сельскай гаспадаркі, актыўна прымяняюцца пестыцыды. Гэта не можа не адбівацца на здароўі пчол.

— Нікаціноіды, якія змяшчаюцца ў гэтых прэпаратах, актыўна выкарыстоўваюцца на пасевах рапсу і сланечніку для абароны ад лістагрызучых і іншых насякомых, — распавядае Дзмітрый Рахматулін. — Праз нектарнікі гэтыя рэчывы трапляюць да пчол, што прыводзіць да аслаблення, атручвання расплоду або да іх смерці, не кажучы ўжо пра пагаршэнне якасці мёду. Ад апрацовак рапсу так ці інакш пакутуе да 10% пчаласем'яў у Беларусі.

Праблема ў тым, што ў рэгламентах па вырошчванні рапсу пазначана: ён павінен апрацоўвацца ў фазе бутанізацыі, гэта значыць да цвіцення. Але далёка не заўсёды, па фінансавых або іншых прычынах, гэтыя работы выконваюцца своечасова.

Аднак незабруджаныя палі могуць несці шкоду крылатым апыляльніцам. Вялікія тэрыторыі, занятыя пад адну культуру, і знішчэнне пустазелля не даюць магчымасці пчале выкарыстоўваць іншыя медоносы. Зона яе актыўнасці складае ў сярэднім каля 6 км ад месца размяшчэння, і калі побач не вырошчваюцца іншыя культуры, насякомае не атрымлівае дастаткова вітамінаў, мінеральных рэчываў і ў выніку гіне.

## Пчаляру неабходны веды

Значны ўплыў на здароўе пчоласем'яў аказвае і ўзровень прафесіяналізму пчаляроў, перакананы Дзмітрый Рахматулін. Няведанне біялогіі пчалы і іншых нюансаў таксама можа прывесці да гібелі насякомых.

— У нашай краіне практычна не вучаць пчалярству, хоць гэта такая ж шматгранная галіна сельскай гаспадаркі, як, напрыклад, авечкагадоўля, — кажа Дзмітрый Канстанцінавіч. — Адзіная ўстанова, якая займаецца падрыхтоўкай пчаляроў, — Смілавіцкі дзяржаўны аграрны каледж — сёння прапануе толькі завочную форму навучання. Некаторыя пчаляры-аматары займаюцца на розных курсах. У той жа час у суседняй Польшчы дзейнічае найбуйнейшы пчалярскі тэхнікум, які рыхтуе пчаляроў для ўсёй Еўропы, Канады і ЗША. Кафедры пчалярства ёсць у шасці сельскагаспадарчых універсітэтах гэтай краіны.

## Ад гібелі выратуе... арэнда

Нягледзячы на праблемы, шанцы на развіццё папуляцый беларускіх пчол усё ж ёсць. Магчыма, гэтаму паспрыяе актыўнае супрацоўніцтва пчаляроў з рознымі сельскагаспадарчымі арганізацыямі праз апыленне. Гэты важны агратэхнічны прыём дазваляе без дадатковых укладанняў значна павялічыць ураджайнасць культур, якія вырошчваюцца. Так, пасля апылення ўраджай грэчкі павышаецца на 20-40%, рапсу — да 30%, садовых культур — да 100%.

— Няведанне гэтага пытання цягне за сабой страту ўраджайнасці ўсіх энтамафільных культур, — упэўнены Васіль Кавалец. — А пчолаапыленне не ўключана сёння нават у Праграму развіцця вытворчасці насення алейных культур, алейнатлушчавай прадукцыі і бялковага корму ў Рэспубліцы Беларусь на 2012—2015 гады.

У іншых краінах гэтаму пытанню надаюць больш увагі. Фермеры ў ЗША, Германіі, Польшчы, Літве часта запрашаюць пчаляроў для апылення раслін. Не так даўно пчол арандавалі і ў Беларусі, але сёння, па словах Васіля Кавальца, такіх выпадкаў практычна няма — як сярод дзяржаўных сельгаспрадпрыемстваў, так і фермерскіх гаспадарак, хоць выгада гэтага працэсу відавочная. Напрыклад, вырошчванне самаапыляльных агуркоў, што шырока практыкавалася на Століншчыне, пры аплаце арэнды пчоласем'яў у памеры 100 долараў ЗША прыносіла прыбытак да 1000 долараў.

## Ураджай праблем

Мёд — галоўны прадукт працы пчол і дзейнасці пчаляра сёння. Яго рэалізацыя дазваляе не толькі пратрымацца пчальніку на плаву, але і атрымаць значны прыбытак. Аднак сёння такога поспеху дасягаюць толькі нешматлікія пчаляры.

Па словах **Міхаіла ХАЛАДЗІНСКАГА, старшыні Саюза грамадскіх аб'яднанняў беларускіх пчаляроў**, буйныя вытворцы, з «ураджаем» у 5—10 тон мёду штогод, знаходзяць пункты збыту — беларускія супермаркеты, замежныя рынкі. Іншая справа з пчалярамі сярэдняга ўзроўню, якіх большасць. Многія з іх не могуць цалкам рэалізаваць свае мядовыя запасы. Не дапамагаюць у гэтым і розныя кірмашы, якія ў апошні час атрымалі не зусім добрую славу.

— Кожная ўвезеная ў рэспубліку тона мёду ў сярэднім забівае ад 20 да 40 пчоласем'яў, бо робіць іх утрыманне нерэнтабельным, — адзначае Дзмітрый Рахматулін. — Нягледзячы на гэта, я перакананы, што замежны мёд з медаблоку, якія ў нас не растуць, павінен прадавацца ў Беларусі. Але далёка не заўсёды завезены прадукт наогул можна назваць мёдам. Гэта цукроза, расшчэпленая пры дапамозе штучных ферментаў. І ў афіцыйных дакументах ён павінен называцца «мядовы прадукт». Нядобрасумленныя ж прадаўцы выстаўляюць яго як мёд.

Таму і каштуе ён танна — каля долара за кілаграм. Такая цана для натуральнага мёду занадта малая, бо яна нават не пакрывае выдаткі пчаляроў.

Па словах Васіля Кавальца, абараняючы прадаўца, дзяржава абмежавала колькасць праверак, і проста так санітарныя службы не могуць праверыць у іх дакументы, не заўсёды пытаюцца іх і пакупнікі. Усё гэта паспрыяла падзенню рэйтынгу натуральнага беларускага мёду.

Адзінай гарантыяй набыцця якаснага прадукту спецыялісты бачаць у куплі мёду непасрэдна ў пчаляра на пчальніку.

## Навука, якая аб'ядноўвае

Каб меданосныя пчолы адчувалі сябе добра на беларускай тэрыторыі, неабходны пільны аналіз сітуацыі, перакананы ў НПЦ НАН Беларусі па біярэсурсах. Сёння селекцыя накіравана на вывядзенне менш агрэсіўных і больш працавітых насякомых, што прыводзіць да іх хуткага зносу і гібелі.

На дапамогу павінны прыйсці дзікія апыляльнікі. У НПЦ па біярэсурсах думаюць аб магчымым аднаўленні ў Беларусі дзікай пчалы як віду. Для гэтага трэба знайсці прыдатную папуляцыю-крыніцу.

Лабараторыя пчалярства і НПЦ па біярэсурсах гатовыя ўзяць на сябе ролю каардынатараў у пчалярскай галіне, навуковага пасярэдніка паміж Мінсельгасхарчам і пчалярамі.

У наступныя гады вучоныя плануюць вывучыць, наколькі бяспечна для прыроды масіраванае ўздзеянне пчол у адной мясцовасці, якія пестыцыды або часовыя рамкі падыходзяць для захавання інтарэсаў усіх бакоў, павінна быць распрацавана лагістыка пчалярства.

— Пчалярства — гэта не толькі апыленне сельгаскультур і вытворчасць мёду, але і маса іншых прадуктаў, якія пакуль выкарыстоўваюцца неэфектыўна з пункту гледжання эканомікі, — кажа Алег Барадзін, генеральны дырэктар НПЦ НАН Беларусі па біярэсурсах. — Па кожным з іх трэба распрацаваць методыкі прымянення.

Васіль Кавалец таксама перакананы, што пчаляру трэба атрымліваць не толькі мёд, але і іншыя прадукты (пылок, пяргу, пчаліны яд, воск, праполіс, трутневы гамагенат, матачнае малачко, экстракт васковай молі), тым самым ён павысіць рэнтабельнасць пчальніка. Пакуль жа ў гэтай сферы існуюць праблемы.

Спецыялісты НПЦ па біярэсурсах таксама плануюць распрацаваць у краіне сістэму апіманіторынгу — ацэнкі навакольнага асяроддзя з выкарыстаннем меданосных пчол і прадуктаў пчалярства.

— Рэалізацыя гэтых і іншых ідэй, упэўнены, дапаможа стабілізаваць узаемаадносіны паміж сістэмамі, — кажа Алег Барадзін. — Усе разумеюць, наколькі важна захаваць пчол, але не самім па сабе, а створаную пры іх удзеле глабальную сістэму. Захаванне пчол і прыроды павінна стаць агульнай справай.

**Вераніка КОЛАСАВА**
*kolasava@zviazda.by*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Экалагічны лікбез

**Каго ні спытай, упэўнены, кожны адкажа, што любіць прыроду, разумее, як важна клапаціцца аб яе ахове. Толькі часам праз такую «любоў» навакольнае асяроддзе якраз і церпіць, а віноўнікам гэтага даводзіцца адказваць згодна з літарай закона...**

### ПАДСТРЭЛІЎ РЭДКАГА ГОСЦЯ

**У паляўнічых угоддзях каля вёскі Літва Стаўбцоўскага раёна група паляўнічых-зайчатнікаў высочвала здабычу. Мужчыны ішлі ўздоўж узлеску і не бачылі, што з іншага боку да іх накіроўваюцца супрацоўнікі ўпраўлення аператыўнага рэагавання Дзяржінспекцыі. На вачах інспектараў адзін з паляўнічых ускінуў стрэльбу і выстраліў у бок дрэва, з якога ўпала птушка. Мужчына падабраў здабычу, паказаў яе таварышу і схаваў пад куртку.**

— А тут праз лічаныя секунды на ўскрайку лесу з'явіліся дзяржінспектары. Апраўдвацца было бессэнсоўна, і паляўнічы, жыхар пасёлка Міханавічы Мінскага раёна, адразу прызнаў сваю віну. На Стаўбцоўшчыну ён прыехаў пагасцяваць і папаляваць. Па словах парушальніка, яго ўвагу прыцягнуў незвычайны знешні выгляд птушкі. Ён ужо нават уявіў, як яе чучала ўпрыгожыць камінную палічку, — расказала **прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга ГРАМОВІЧ.**

Птушка сапраўды аказалася незвычайным госцем. Па заключэнні экспертаў, гэта махнаногі канюк, якога яшчэ называюць зімняком, з сямейства ястрабіных. Від занесены ў спісак CITES. Жыве зімняк пераважна ў тундры і лесатундры, у Беларусі ён рэдкая залётная птушка. За незаконную яе здабычу заведзена крымінальная справа па артыкуле 282 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь. У якасці пакрыцця шкоды паляўнічаму трэба будзе выплаціць 31,5 мільёна рублёў. Верагодна, парушальніка чакае яшчэ і буйны штраф.

### ДАБРЫНЯ ПА-ЗА МЕЖАМІ ЗАКОНА

**Жаданне аказаць дапамогу братам нашым меншым — цалкам натуральнае праява любові чалавека да дзікай прыроды, але яна далёка не заўсёды апраўдана з пункту гледжання біялогіі і законнасці.**

Сустрэўшы, напрыклад, аленяня, ласяня, зайчаня, неабходна як мага хутчэй пакінуць месца яго пражывання і ні ў якім разе не дакранацца да жывёлы. Варта памятаць, што самкамаці знаходзіцца паблізу і чалавек сваёй прысутнасцю замінае ёй вярнуцца да дзіцяняці.

Калі відавочна, што жывёла знаходзіцца ў бядзе (паранена, траўмавана) альбо загінула, неабходна паведаміць пра гэта карыстальніку паляўнічых угоддзяў або ў аператыўна-дзяжурную службу тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў, або ў дзяжурную службу раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях. Самавольнае перамяшчэнне дзікіх жывёл, у тым ліку загінулых, з'яўляецца парушэннем і можа пацягнуць за сабой адміністрацыйную, а ў некаторых выпадках нават крымінальную адказнасць.

— Калі гаворка ідзе пра перамяшчэнне дробных жывых дзікіх жывёл або загінулых (скажам, качка ці заяц), якія па таксах нанесенай шкоды ацэньваюцца ў суму, меншую за сто базавых велічынь, адказнасць наступае згодна з часткай 2 артыкула 15.37 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях «Парушэнне правілаў вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання». У гэтым выпадку можна атрымаць штраф у памеры да 50 базавых велічынь, — тлумачыць Вольга Грамовіч.

### ЗА «ЗНОЙДЗЕНАЕ» МЯСА МОЖНА СТРАЦІЦЬ СВАБОДУ

**Год таму ўступілі ў сілу новыя рэдакцыі артыкулаў Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь і Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях, якія датычацца адказнасці за незаконнае паляванне і рыбалоўства.**

Адной з самых важных і чаканых стала норма па ўвядзенні крымінальнай адказнасці за незаконную транспарціроўку і разбор дзікіх жывёл. За мінулы год дзяржінспектары выявілі некалькі дзясяткаў падобных выпадкаў. Многія з парушальнікаў ужо пакараны буйнымі штрафамі, прыгавораны да пазбаўлення альбо абмежавання волі. Склалася і судовая практыка канфіскацыі транспартных сродкаў, на якіх перавозілася незаконная здабыча.

— Год таму ў Крымінальным кодэксе Рэспублікі Беларусь менавіта адказнасць за транспарціроўку была выдзелена ў асобны артыкул 282-1 «Незаконнае перамяшчэнне (транспарціроўка) ці разбор дзікіх жывёл». Для вызначэння памеру пакрыцця шкоды, нанесенай навакольнаму асяроддзю фізічнымі і юрыдычнымі асобамі ў выніку незаконнага здабывання ці знішчэння дзікіх жывёл і шкоднага ўздзеяння на асяроддзе іх пражывання, ёсць таксы ў базавых велічынях. Калі незаконна перамяшчаецца буйная (напрыклад, дзік, лось) загінулая ці здабытая на тэрыторыі запаведніка жывёла, або яна адносіцца да катэгорыі чырванакніжкіх і па таксе шкода складае больш за сто базавых велічынь, адказнасць вінаватых наступае менавіта па вышэйназваным крымінальным артыкуле. Ён прадугледжвае пакаранне ў выглядзе штрафу, арышту, абмежавання або пазбаўлення волі тэрмінам да трох гадоў, — распавяла прэс-сакратар Дзяржінспекцыі Вольга Грамовіч.

Так, за незаконную транспарціроўку мяса дзіка паляўнічаму з Мінска давялося выплаціць 54 мільёны рублёў. Жыхар Слоніма за перавозку і разбор тушы дзіка прыгавораны да аднаго года і двух месяцаў абмежавання волі з канфіскацыяй аўтамабіля і паляўнічай стрэльбы. З 45 мільёнамі і аўтамабілем развітаўся гродзенец, які перавозіў без дакументаў мяса казулі.

### Дарэчы

*У сувязі з узмацненнем адказнасці за незаконныя паляванне і рыбалоўства колькасць выяўленых сёлета грубых парушэнняў з прыкметамі крымінальных зменшылася на 11 працэнтаў. Разам з тым паўната і адэкватнасць пакарання дазволілі спагнаць з парушальнікаў удвая больш штрафаў: за 10 месяцаў гэтая сума склала 18 мільярдаў рублёў.*

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Усё, што вы хацелі ведаць пра...

# ДАГІСТАРЫЧНЫХ ЖЫВЁЛ НА НАШАЙ ЗЯМЛІ

**Калі заходзіць размова пра старажытных насельнікаў планеты, многія з нас узгадваюць найперш дыназаўраў ды мамантаў. Але і да іх існавалі не менш цікавыя прадстаўнікі жывёльнага свету. З імі знаёміць дацэнт кафедры інжынернай геалогіі і геафізікі геаграфічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, палеантолаг Аляксандр МАТУЗКА.**

## ЧАМУ НА БЕЛАРУСІ НЕ БЫЛО ДЫНАЗАЎРАЎ?

З часоў архея (3,5 млрд гадоў таму) да нас дайшлі не жывёлы, а толькі сляды іх жыццядзейнасці — страматаліты. У кембрыі (541-1 млн гадоў назад) з'явіліся губкавыя, альбо спангіяты. Жыхары мора з'яўляюцца аднымі з самых прымітыўных шматклетачных жывёл. Яны служылі біялагічнымі фільтратарамі вады. Здараецца, людзі іх знаходзяць, калі капаюць агарод. Часта трапляюцца эндацэрасы — вялізныя галаваногія малюскі. Цела драпежніка, падобнага да гіганцкай цыгары, магло дасягаць трох метраў. Ранні палеазой называюць часам трылабітаў, хоць у Беларусі палеантолагі знаходзяць іх вельмі рэдка. Марскія членістаногія былі першымі біялагічнымі «прыбіральшчыкамі». Харчуючыся беспазваночнымі, трылабіты тым самым ачышчалі марское дно.

Дэвон (пачаўся 419,2-3,2 млн гадоў таму) называюць эпохай рыб, бо ў гэты перыяд актыўна развіваліся пласцінаскурыя рыбы, у якіх сталі з'яўляцца зубы. Абжывалі сушу першыя пазваночныя. Самымі яркімі прадстаўнікамі эпохі сталі ракаскарпіёны, вядомыя таксама як марскія скарпіёны, альбо эўрыптэрыды. Яны вадзіліся ў марах на мелкаводдзі, і маглі не толькі плаваць, але і поўзаць. У працэсе эвалюцыі ракаскарпіёны перабраліся ў прэсную ваду. Нядаўна закамянелага ракаскарпіёна знайшлі ў шахце Салігорска.

Юрскі перыяд (пачаўся 201,3-0,2 млн гадоў назад) вядомы ўсім як час дыназаўраў. Усяго налічвалася больш за 1000 відаў гэтых жывёл, яны хутка эвалюцыянавалі. Асятра і кракадзіла, па словах Аляксандра Матузкі, можна назваць сучаснікамі дыназаўраў. Што цікава, на тэрыторыі Беларусі палеантолагі не знаходзяць рэштак дыназаўраў. У той час на месцы нашай краіны знаходзілася вялізнае глыбокае мора, а значыць сухапутных жывёл тут быць не магло.

## ДЗЕ АДКОПВАЮЦЬ МАМАНТАЎ?

У познім плейстацэне (70-10 тысяч гадоў назад) на планеце сфарміраваўся цэлы фаўністычны комплекс млекакормячых жывёл, таксама вядомы як «мамантава фаўна».



Фота Надзеі БУЖАН.

Зуб дарослага маманта.



Так выглядалі «прыбіральшчыкі» трылабіты.



Людзі знаходзяць губкі, калі капаюць агарод.

Самым яркім і пазнавальным, а да таго ж буйным прадстаўніком групы быў шарсцісты мамант. Акрамя мамантаў, на тэрыторыі Беларусі жыў пячорны мядзведзь — дагістарычны від мядзведзяў. Палеантолагі знаходзяць таксама рэшткі шарсцістых насарогаў (зніклі прыкладна 9-14 тысяч гадоў таму). Ад сваіх сучаснікаў яны адрозніваліся тым, што ногі ў іх былі карацейшыя, а цела і галава моцна выцягнутыя. З прадстаўнікоў мамантавай фаўны ў Беларусі таксама знойдзены рэшткі бізонаў і паўночных аленяў, аўцабыкоў.

Самы багаты палеанталагічны матэрыял на тэрыторыі краіны даследчыкі атрымліваюць у ваколіцах Смаргоні. На другім месцы па запасах «старажытнасцяў» — гранітны кар'ер у Мікашэвічах. Тут знаходзяць рэштткі палеагенавых акул, мамантаў, шарсцістых насарогаў. Замыкае тройку Жлобін. Час ад часу пры раскопках у вялікіх гарадах сустракаюцца рэшткі мамантаў. Напрыклад, некалькі гадоў таму на сталічнай вуліцы Машынабудаўнікоў, у рэчышчы старажытнай Свіслачы, была знойдзена 19 асобін старажытных сланоў розных узростаў.

## АДКУЛЬ РАСЦЕ ХВОСТ У ЦМОКА?

Нягледзячы на навуковыя пацверджанні існавання старажытных жывёл, у беларускім фальклоры сфарміраваны ўяўленні пра жывёл міфічных. Усім вядомы лятучы змей, тутэйшы Цмок. Ён мае тры, шэсць, сем, дзевяць альбо дванаццаць галоў, жыве ў балоце ці ў моры ды ходзіць у лазню. Існуе таксама Клетнік — цмок, які жыве ў клеці ды прыносіць гаспадару схаваныя скарбы. Фалькларыст Павел Шпілеўскі апісаў цмока як «дух у выглядзе змяі». **Спецыяліст па змеях, герпетолаг дзяржаўнага навукова-практычнага аб'яднання «Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук па біярэсурсах» Сяргей ДРАБЯНКОЎ** адзначае, што цмокі вельмі падобныя да трытонаў — жывёл з атрада хвастатых земнаводных. Яны вядуць як водны, так і наземны лад жыцця, валодаюць здольнасцю да рэгенерацыі. З іншага боку, цмок падобны і да змяі, культ якой быў пашыраны ў нашых продкаў.

Акрамя лятучага змея, у беларускім бестыярыі таксама існуюць цар усіх ракаў Хабёр, цар вужыны Жалгіун-Каралюс (балцкая назва), цар птушак Кук, кароль кашэчы — Варгін. Вядомы Яшчар — магчымае адгалінаванне вобразу Цмока, вужалкі — дочкі змяінага караля, а таксама чорная калматая жывёліна — Меша. Трапіць на шлях міфічных істот цяжка. Хоць на пошукі цмока ўжо ладзіліся адмысловыя экспедыцыі. Праўда, старажытную істоту злавіць не ўдалося — ён дужа хітры і спрытны.

**Марына ШЫПУЛЬКА**

■ У свеце жывёл

# ЗНАЁМЦЕСЯ: ПТУШКА 2016 ГОДА Ў БЕЛАРУСІ,

## ці Чым незвычайны звычайны гогаль

**Зусім хутка ўсіх аматараў прыроды чакаюць шматлікія акцыі і конкурсы ад «Аховы птушак Бацькаўшчыны», падчас якіх можна будзе бліжэй пазнаёміцца з гэтым чорна-белым прыгажуном, а таксама зрабіць яго жыццё крышку больш шчаслівым.**



Фота Віктара КАЗЛОЎСКАГА.

Па словах **супрацоўніка па прыродаахоўных пытаннях АПБ Вольгі ЛУКШЫЦ**, гогаль не будуе гнязда на зямлі, як большасць суродзічаў з сямейства качыных, а займае дуплы старых дрэў. «На многіх тэрыторыях уздоўж азёр і рэк засталося мала старых дуплаватых дрэў, і птушкі не могуць знайсці прыдатнага месца для гнязда, — расказвае Вольга Лукшыц. — Вырашыць праблему могуць біятэхнічныя мерапрыемствы: пабудаваць «дупло» можа любы чалавек. Мы раскажам, як зрабіць домік для гогаля, правядзём майстар-класы для ахвотных і разам будзем вырашаць «кватэрнае пытанне» птушак. Асобную ўвагу нададзім вясеннюму і асенняму паляванню на вадаплаўных: гогаль не з'яўляецца паляўнічым відам, але часта церпіць з-за неадукаванасці паляўнічых».

***Якія ж цікавыя факты звязаныя са звычайным гогалем?***

➤ Звычайны гогаль — адзін з 15 відаў качак, якія гняздуюцца ў Беларусі.

➤ Радзімай гогаля лічыцца Паўночная Амерыка, адкуль птушка перабралася спачатку ў Азію, а затым распаўсюдзілася па ўсім паўночным паўшар'і.

➤ Увесну беларускія гогалі аднымі з першых спяшаюцца на радзіму з зімовак у Заходняй Еўропе. Некаторыя асобіны застаюцца на зіму і ў нашай краіне.

➤ З лютага самцы пачынаюць такаваць — выконваць адмысловы «танец», які прыцягвае самак. Качар распускае хвост, закідае галаву, «бразгоча» голасам і падымае вакол сябе фантан пырскаў.

➤ Гогаль — качка, якая гняздуецца ў дуплах дрэў. Домам для іх становяцца і спецыяльныя гнездавыя скрыні (гагалятнікі), якія чалавек можа развесіць недалёка ад вады. Менавіта дзякуючы ім гэтая птушка вырашыла «кватэрнае пытанне», павялічыла сваю колькасць у Беларусі і ў 2004 годзе пакінула Чырвоную кнігу.

➤ Пры недастатковай колькасці дуплаў у месцах гняздоўя паміж самкамі назіраюцца бойкі за авалоданне гняздом. Нярэдка ў адным дупле нясуцца адразу дзве качкі гогаля.

➤ Качаняты выскокваюць з дупла на покліч маці. Першы выхад у вялікі свет можа пачынацца з 15-метровага скачка! Птушаняты не ўмеюць лётаць і проста парашутуюць, растапырыўшы крыльцы і перапонкі на лапах.

➤ Гогаль харчуецца воднымі насякомымі, ракападобнымі і малюскамі. Ежу здабывае са дна на глыбіні да 10 метраў.

➤ Насяляе сажалкі і рэкі, каля якіх ёсць старыя лясы. Можа жыць на азёрах сярод мохавых балот, дзе слабая кармавая база і іншых качак не сустрэнеш.

➤ Гогаля ў палёце можна вызначыць нават з заплюшчанымі вачамі: у яго па-асабліваму «свішчуць» крылы.

➤ Самы стары гогаль, па даных кальцавання, пражыў 16 гадоў і 11 месяцаў.

➤ Магчыма, назва «гогаль» узнікла ад чувашскай мянушкі «гогул». Падобныя назвы ёсць у чэшскай (hohol severni), славацкай (hlaholka severska), польскай (gagol), латышскай (gegals) мовах. Англічане вырашылі звярнуць увагу на жоўты колер вачэй качара і назвалі яе «Goldeneye» («залатое вока»).

➤ Птушка 2016 года ў Беларусі — галоўны герой фразеалагізма «хадзіць гогалем». Устойлівае словазлучэнне, якое азначае «мець бравы, незалежны выгляд», нарадзілася выключна дзякуючы незвычайнай паходцы гэтай птушкі. Яна ходзіць павольна і перавальваючыся, нібы важная, самазадаволеная асоба ■

■ У свеце раслін

# ЦУКРОВЫЯ «СЛЁЗЫ» І ПРЫСМАКІ З ЛІСЦЯ

**Клён — адно з самых прыгожых ліставых дрэў, якое расце ў Беларусі. Але ці шмат мы пра яго ведаем?**

Адкуль да нас прыйшоў клён? Палеантолагі знайшлі «прапрадзедаў» гэтага роду ў верхнемеловых адкладах Анадырскага і Лена-Калымскага басейнаў. Нялёгка ўявіць, што клён, больш паўднёвае дрэва, шамацеў лісцем у Грэнландыі, на Шпіцбергене. Ён падняўся ў горы Усходняй Азіі, быццам бачыў у тым выратаванне ад пагібелі. І цяпер там найбольш поўна прадстаўлены ўсе віды клёна. З гэтых мясцін пачалося паступовае перасяленне дрэва на іншыя тэрыторыі — у Амурскую вобласць, Еўропу, Японію і нават на астравы Малайскага архіпелага.

Першым некалькі стагоддзяў таму ў баярскія і манастырскія сады прыйшоў клён вастралісты — яго высаджвалі пад малады месяц, захутвалі ў рагожы, прывучаючы да пераменлівага надвор'я сярэднярускай паласы. У пачатку XVII стагоддзя пачалося ўвядзенне ў паркавую культуру іншых відаў — татарскага, ясенялістага, манчжурскага.

Клён вастралісты дае сок жаўтаватага колеру. Да таго ж ён здольны «плакаць», як толькі вільготнасць паветра павышаецца: з месцаў разрыву чаранкоў лісця падаюць кроплекі. А вясной на саладкаваты сок зляталюцца розныя насякомыя. Калі «смаката» крыху забродзіць, усе кузуркі на месцы «засынаюць». Дарэчы, кляновы сок ні ў чым не саступае бярозаваму, у ім 2-3% цукрозы і вінаграднага цукру. У амерыканскага клёна сок яшчэ саладзейшы (4-6%). Ён лічыцца самым цукровым сокам дрэва і вельмі блізкі да сыравіны, з якой робяць трысняговы цукар. Пра якасці «кляновых слёз» індзейцы Паўночнай Амерыкі ведалі задоўга да з'яўлення там еўрапейцаў. Для іх ён быў вельмі важным прадуктам харчавання. У былыя часы нашы прашчуры выпарвалі з клёна цукар.



Кляновае лісце ў фрыцюры.



Зграбныя лісточкі клёна серабрыстага.

Калі ўлічваць, што маецца мноства незвычайных формаў, то клён можна назваць самым дэкаратыўным дрэвам. Ён эфектна выглядае ў розных пасадках: выкшталцоныя лісточкі клёна серабрыстага і Шведлера могуць супернічаць з букетам самых экзатычных кветак. Формы клёна вастралістага гарадць чырванню на працягу ўсяго сезона. Ёсць у іх і яшчэ адна перавага: ствараючы шчыльную крону, пасадкі гэтых дрэў яшчэ і ахоўваюць ад спёкі, пылу, шуму. Да таго ж клёны энергічна засвойваюць з атмасферы талуол і бензол, ачышчаючы ад шкодных рэчываў паветра і выдзяляючы фітанцыды, якія забіваюць мікраарганізмы.

**ЦІКАВЫЯ ФАКТЫ**

*Кожнае дарослае дрэва цукровага клёна можа даць за дзень больш як 10 літраў соку, за год — ад 50 да 100 літраў. За вясенні сезон — ад 2,5 да 10 кг цукру. Для параўнання: з 1 кілаграма буракоў атрымліваюць у сярэднім 160-170 грамаў цукру.*

Галінка клёна стала эмблемай Канады з пачатку XVIII стагоддзя. А ў XX ст. кляновы ліст заняў годнае месца і на дзяржаўным сцягу, з часам ён стаў сімвалам нацыі.

*У некаторых рэгіёнах Японіі папулярны перакус — кляновае лісце ў фрыцюры. Яго вытрымліваюць год у бочках з соллю, потым пакрываюць асаблівым салодкім цестам і смажаць у алеі.*

Кляновыя алеі з блізка пасаджанымі дрэвамі — 5-7 метраў — цудоўны біяэнергетычны калідор.

**Таццяна МАІСЕЕВА** ■

■ Друкуецца ў «Роднай прыродзе»

# БЕЛАРУСКІ ЛОСЬ НА ЭМБЛЕМЕ ПОЛЬСКАГА НАРОДНАГА ПАРКУ

**Гуляючы па лясным гушчары, можна заўважыць зламаныя кусты, абадраныя дрэўцы, вытаптаную зямлю і вялікія свежыя сляды. Гэта сведчыць аб тым, што нядаўна тут пабываў парнакапытны гігант нашых лясоў — лось еўрапейскі.**



Фота Дзяніса ІЎКОВІЧА.

### Самы буйны ў сваёй сям'і

Лось уваходзіць у так званую «Вялікую еўрапейскую пяцёрку» буйных млекакормячых, якія жывуць у дзікіх умовах Бярэзінскага біясфернага запаведніка. Дарэчы, колькасць ласёў тут — каля дзвюх з паловай сотняў. Яны звычайна сустракаюцца ў маладых насаджэннях хвоі, вербалозу і на ўскраінах балот, дзе заўсёды шмат зялёнага корму. Але самае любімае месца іх пражывання — пойма ракі Бярэзіны з багаццем трысняговых зараснікаў, нізкарослых хмызнякоў і невысокіх дрэў. Іх парасткі складаюць аснову рацыёну ў летні перыяд. Нярэдка ласі сілкуюцца воднай расліннасцю, якую могуць здабываць у вадзе. А ў мнагаснежныя зімы яны ўтвараюць працяглыя «стойбішчы» ў хваёвых маладняках, дзе могуць начыста з'ядаць верхавіны сасёнак.

Буйнейшага за лася ў сямействе аленевых няма нікога. Гэта сапраўдная грамадзіна: вышыня дасягае двух метраў, а даўжыня цела — амаль тры! Пры гэтым жывёла грацыёзная, часткова дзякуючы сваім доўгім нагам у светлых, амаль белага колеру, «гольфах». Своеасаблівую прыгажосць звера падкрэсліваюць пышнае чорна-бурае цела і гарбаносая галава з вялікімі вушамі і «завушніцай» — скурным выростам, падобным на бараду, на шыі ў дарослых самцоў. Маленькія вочы глядзяць з мяккім смуткам, верхняя губа пухлая, навіслая, ноздры вялікія, шырокія. Лася называюць «сахатым» з прычыны даволі галінастых і лапатападобных рагоў, якія сваёй формай нагадваюць саху. Штогод у лістападзе-снежні гэты галаўны ўбор скідаецца на зіму.

### Час для бою!

Рогі ласю асабліва патрэбны восенню, у перыяд гону, калі паміж самцамі адбываюцца лютыя бітвы. З канца жніўня па кастрычнік лось выкарыстоўвае іх у якасці грознай зброі абароны і нападзення. У гэты перыяд самцы становяцца менш асцярожнымі і нават агрэсіўнымі, паміж імі ідуць баі за самак. Сутычкі самцоў часцей маюць дэманстратыўны характар, але нярэдкія і жорсткія, якія заканчваюцца нават калецтвам аднаго з сапернікаў. Зрэдку, выдаючы гукі-стогны, ласі змагаюцца і з дрэвамі, успрымаючы іх за саперніка, у злосці ламаюць рагамі іх тонкія ствалы.

### Свойская жывёла

Яшчэ да вайны ў Бярэзінскім запаведніку пачаліся даследаванні па прыручэнні ласёў. У 1936 годзе два ласі ва ўзросце дзесяці месяцаў былі злоўлены і змешчаны ў загон памерам каля дзесяці гектараў. Але спробы прыручыць жывёл скончыліся няўдачай. На гэтым вялікім участку яны заставаліся такімі ж дзікімі, як і на волі. Пазней злавілі іншых ласёў, якіх трымалі ўжо на спецыяльна пабудаванай ферме. За некалькі гадоў тыя так прывыклі да людзей, што самі падыходзілі да супрацоўнікаў «ласятніка». А ў маі 1941 года тут адбылася радасная падзея — упершыню ў няволі нарадзіліся маленькія ласяняты. Так у гэтым гадавальніку сфарміраваўся цэлы статак.

### Падарунак з Беларусі

У 1951 годзе ў якасці абмену ў Кампінаскі нацыянальны (народны) парк (Польшча) з Бярэзінскага запаведніка былі перавезены 5 асобін (2 самца і 3 самкі) ласёў. Гэтыя жывёлы былі практычна цалкам знішчаны ў Польшчы ў сярэдзіне XIX стагоддзя. Зараз яны дамінуюць у пушчы па колькасці сярод буйных відаў млекакормячых і ствараюць папуляцыю звыш 300 асобін. Можна з упэўненасцю сказаць, што менавіта беларускі лось з'яўляецца сімвалам Кампінаскага парку і горда красуецца на яго афіцыйнай эмблеме.

**Анастасія РЫЖКОВА,**
**малодшы навуковы супрацоўнік Бярэзінскага біясфернага запаведніка**

**Не спазніцеся выпісаць часопіс**

**«РОДНАЯ ПРЫРОДА»!**

- ✓ Самая цікавая і патрэбная інфармацыя са свету дзікай прыроды і экалогіі Беларусі;
- ✓ падарожжа па нязведаных мясцінах краіны і свету;
- ✓ дыскусіі па экалагічных праблемах планеты;
- ✓ як даглядаць братоў нашых меншых;
- ✓ асновы пчалярства;
- ✓ сакрэты ўдалай рыбалкі і яшчэ шмат іншых цікавых тэм.

Для маленькіх чытачоў у выданні схаваны «падарунак» — яшчэ адзін часопіс

**«ЮНЫ НАТУРАЛІСТ»**

Будзь разам з «Роднай прыродай»!

Аформіць падпіску можна кожны месяц.
Падпісныя індэксы:
74926 — для індывідуальных падпісчыкаў;
749262 — для ведамасных падпісчыкаў.

**Чытайце ў лістападаўскім нумары часопіса «РОДНАЯ ПРЫРОДА»:**



— Дзе нараджаюцца туманы?
— Час збіраць адпрацаванае масла!
— Што за «мядзведзі» ў космасе пабывалі?
— Хутка Новы год: адкрываем ёлачную экамайстэрню!
— Конскі каштан — дрэва, якое лечыць.

■ Незнаёмцы з Чырвонай кнігі

# АМАТАР БУРАЙ ВАДЫ

## стаў ахвярай меліярацыі і «прышэльцаў»

**Сёлета азёрны гальян — прадстаўнік сямейства карпавых — упершыню трапіў у спіс чырванакніжнікаў. Невялікая рыбка залацістага колеру, падобная да ліня, знаходзіцца пад аховай у Польшчы і ва Украіне. У Беларусі яна вядома пад імёнамі аўдотка, сняток, гаркушка, гарчак. Ад свайго брата — звычайнага гальяна — адрозніваецца ўзорам на целе ў дробную крапінку (у таго ж па баках ідуць цёмныя палосы).**



Раней азёрнага гальяна было шмат у дробных вадаёмах Гомельскай вобласці і паўднёва-заходніх Брэсцкай. Аднак за апошнія дзесяцігоддзе від знік з многіх былых «месцаў пражывання». Даследчыкі фіксуюць толькі адзінкавыя кропкі яго знаходжання, якія адразу ж бяруцца пад ахову. Навукоўцы мяркуюць, што на зніжэнне папуляцыі рыбы паўплывала меліярацыя вадаёмаў. Акрамя таго, зрабілі сваю чорную справу інвазіўныя віды — прышлы ратан-галавешка высесціў гальяна з прывычнага асяродку. Зараз у Беларусі ён захаваўся толькі ў басейне Дняпра і Заходняга Буга.

Гаркушка водзіцца ў дробных вадаёмах, якія належаць басейнам рэк Паўночнага Ледавітага акіяна ад Паўночнай Дзвіны і на ўсход да Калымы. У басейнах сярэдняй Волгі, верхняга і сярэдняга Дняпра, Заходняга Буга сустракаецца ізаляваныя рэліктавыя папуляцыі. Адшукаць гальяна можна ў дробных азярках, сажалках, тарфяных каналах і меліярацыйных канавах, дзе няма плыні, але ёсць шмат гумусу, ад якога вада афарбоўваецца ў буры колер. Што цікава, да такіх «неспрыяльных» умоў зможа адаптавацца не кожная рыба, хіба карасі, вярхоўкі ды ўюны.

Аўдотка жыве невялікімі стайкамі. Большую частку жыцця яна праводзіць каля дна, зрэдку падымаючыся да паверхні. Можа пераносіць дэфіцыт кіслароду, нават да поўнай яго адсутнасці. Зімуе, зарываючыся ў глей. Праз уласную марудлівасць часта становіцца ахвярай больш спрытных драпежнікаў. Харчуецца водарасцямі, дробнымі бесхрыбетнымі і лічынкамі насякомых.

У Беларусі азёрны гальян ніколі не быў прамысловым відам, аднак у паўднёвых раёнах Якуціі, дзе яго ўдосталь, рыбу нарыхтоўваюць у марожаным і сушаным выглядзе, выкарыстоўваючы яе ў якасці корму для сабак.

**Кацярына РАДЗЮК.**
*radziuk@zviazda.by*

■ Экасенсацыя

# «ЗОМБІ» Ў ПАЛОНЕ ПАРАЗІТА

**Нядаўна нямецкія вучоныя высветлілі, якім чынам унутрыклетачны паразіт фітаплазма робіць расліны сваімі ахвярамі. У хворых культур замест пялёсткаў вырастаюць лісточкі, яны губляюць здольнасць да размнажэння ды існуюць толькі як прывабнае асяродздзе для насякомых — пераносчыкаў інфекцыі.**

Навукоўцы даведаліся пра заражэнне фітаплазмай яблынь, какосавых пальм, цукровага трыснягу, вінаграду яшчэ ў 60-я гады мінулага стагоддзя. Аднак цяпер генетыкі высветлілі, якім чынам адбываецца працэс захопу раслін. Бактэрыі выпрацоўваюць бялок SAP54, які паўтарае структуру бялку, адказнага за працэс цвіцення. Калі бялкі раслін, якія кантралююць асноўныя праграмы развіцця арганізма, звязваюцца з імі, фарміраванне пялёсткаў ды іншых органаў кветкі спыняецца. Напрыклад, у яблынь з'яўляецца «ведзьміна мятла», то бок з адной кропкі вырастае багата атожылкаў. Дрэва ператвараецца ў густы кустарнік. Часам фітаплазма пашкоджвае тканку, якая пераносіць вугляводы да органаў, ад чаго расліны жаўцеюць і паміраюць.



Зверху — здаровая морква,
знізу — «ахвяра» фітаплазмы.

Фітаплазма выжывае толькі ў заражаных раслінах і стрававальнай сістэме некаторых насякомых, кшталту цыкад альбо кляшчоў, якія пераносяць паразіта да новых гаспадароў. Іншымі словамі, насякомыя карыстаюцца ўсімі выгодамі такога суседства. Расліны выношваюць іх яйкі, пасля харчуюць сваімі лісточкамі іх лічынак і даюць запас фітаплазмы, якую тыя пасля пераносяць да наступных раслін.

Паразіт сустракаецца і ў Беларусі. Ад яго жыццядзейнасці пагаршаецца ўраджай і якасць бульбяных клубняў. Распаўсюджваецца фітаплазма з дапамогай цыкад і кляшчоў, мігруючы са шматгадовага пустазелля (уюнок, палявы асот, цыкорый). Акрамя бульбы, пашкоджвае табаку, таматы, баклажаны, паслён, дурман, буракі, канюшыну. Сустракаецца на яблыні, грушы, малінах, суніцах.

**Марына ШЫПУЛЬКА**

■ Бліц-навіны

## ПАРАЖЭННЕ НА СТАРЦЕ

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра тое, як беларускія баскетбалісткі пачалі кваліфікацыю да чэмпіянату Еўропы 2017 года, а гандбольны СКА зрабіў першы крок да выхаду ў групавы этап ЕГФ.**

**1. Беларускія баскетбалісткі матчам са зборнай Польшчы пачалі адборачны турнір чэмпіянату Еўропы — 2017.** На жаль, першая гульня кваліфікацыі склалася для нашых дзяўчат няўдала. Нягледзячы на тое, што на працягу трох чвэрцяў беларускі ўпэўнена кантралявалі ход сустрэчы, яны не змаглі давесці матч да перамогі — 56:65.



*— Апошняя чвэрць сустрэчы — гэта збіццё. Адсутнічала канцэнтрацыя, якая павінна захоўвацца да канца гульні. Адно ачко на працягу ўсёй чвэрці — даўно не памятаю такога матча. Добра, што ёсць яшчэ адна сустрэча. Павінны мабілізаваць сябе і паказаць, што ўмеем, —* адзначыла пасля гульні **нападаючая зборнай Беларусі Таццяна ТРОІНА.**

Самай выніковай сярод нашых суайчынніц стала Марыя Папова, якая набрала 13 ачкоў, у актыве Алены Леўчанкі на адзін бал менш.

Першая хатняя гульня ў адборачным турніры пройдзе ўжо заўтра: на паркеце мінскага Палаца спорту падапечныя Анатоля Буяльскага сустрэнуцца са зборнай Бельгіі. Астатнія матчы еўракваліфікацыі зборная Беларусі правядзе ў 2016 годзе: 24 лютага дома з полькамі і 19 лістапада ў гасцях у бельгійскай дружыны.

У фінальную стадыю кантынентальнага першынства без адбору трапіла гаспадыня турніру зборная Чэхіі, а астатнія 15 пуцёвак атрымаюць пераможцы дзевяці кваліфікацыйных груп і 6 найлепшых каманд, якія оймуць другія месцы.

**2. Салігорскі «Шахцёр» не змог прабіцца ў суперфінал Кантынентальнага кубка.** У заключным матчы паўфінальнага раўнда гарнякі прайгралі французскаму «Руану» — 0:1. Такім чынам, «Шахцёр» заняў трэцяе месца ў групе «Е». У суперфінал з гэтага квартэта выйшлі «Руан» і польскі «Тыхы».

Нагадаем, Кантынентальны кубак па хакеі беларускія клубы выйгравалі тройчы. У 2007 і 2011 гадах гэта ўдавалася зрабіць «Юнацтву». У 2015 годзе ўладальнікам ганаровага трафея турніру стаў гродзенскі «Нёман».

**3. Гандбалісты мінскага СКА зрабілі ўпэўнены крок да выхаду ў групавы этап розыгрышу Кубка Еўрапейскай гандбольнай федэрацыі (ЕГФ).** У першым паядынку 3-га кваліфікацыйнага раўнда ў гасцях у аўстрыйскага «Харда» віцэ-чэмпіёны Беларусі дамагліся буйной перамогі — 33:23. Самымі выніковымі ў складзе мінчан сталі Арцём Каралёк — 8 мячоў і Аляксандр Пацыкайлік — 7. Паўторная сустрэча гэтых каманд адбудзецца 29 лістапада ў мінскім Палацы спорту.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

## Алена СКРЫПЕЛЬ:

# «СТАМІЛІСЯ АД НЯЎДАЧ»

### Старшыня асацыяцыі гімнастыкі — аб праведзенай працы, крытыцы і планах

**Прайшоў год з моманту, калі Алена Скрыпель была абрана на пасаду кіраўніка Беларускай асацыяцыі гімнастыкі. У гэты невялікі прамежак часу змясцілася шмат падзей, значных для айчыннага спорту. У першую чаргу гэта звязана з тым, што год перадалімпійскі — на турнірах, акрамя медалёў, разыгрываюцца пуцёўкі на галоўныя спаборніцтвы чатырохгоддзя, спартсмены пачынаюць актыўную падрыхтоўку да Гульняў, а спецыялісты «пад мікраскопам» разглядаюць іх вынікі. Да таго ж Мінску сёлета трэба было прымаць чэмпіянат Еўропы па мастацкай гімнастыцы, з чым сталіца, у тым ліку дзякуючы намаганням асацыяцыі, справілася выдатна. Але ўсё ж падзеяй, якая выклікала самыя гарачыя абмеркаванні, стала натуралізацыя амерыканскіх гімнастак і іх выступленне за зборную Беларусі на чэмпіянаце свету.**
**Пра тое, як паставілася да гэтых размоў сама Алена Альбертаўна, якія змены адбудуцца ў айчыннай спартыўнай гімнастыцы і як развіваюцца іншыя віды спорту, што ўваходзяць у асацыяцыю, яна распавяла карэспандэнту «Звязды».**



Фота tut.by.

— Скажу шчыра, калі пастуціла прапанова ўзначаліць асацыяцыю, нават не ўяўляла, што гэта дастаткова сур'ёзны ўчастак работы па часавых характарыстыках і па задачах, якія стаяць перад намі. Напэўна, я ў той момант не разумела, якую адказнасць бяру на сябе. Усё ж пад крылом асацыяцыі 5 відаў спорту (мастацкая гімнастыка, акрабатыка, скачкі на батуце, аэробіка і спартыўная гімнастыка), 3 з іх алімпійскія. З мастацкай гімнастыкай я была досыць знаёмая, спартыўная для мяне, як для гледача, была зразумелай, але не больш за тое. Аб скачках на батуце я таксама мела лёгкае ўяўленне, акрабатыка некалькі бліжэйшая, бо мой дзядуля шмат часу аддаў гэтаму спорту — ён быў трэнерам.

***— У першы ж год на вас звалілася шмат працы. Ці ўсё атрымалася?***

— Час цікавы і складаны, ідзе чэмпіянат за чэмпіянатам, і на кожным, акрамя медалёў, разыгрываюцца ліцэнзіі ў Рыа-дэ-Жанейра. Тым не менш, я рада таму, як прайшоў год. Найперш вынікі нашай працы можна ўбачыць у выступленнях беларускіх спартсменаў на чэмпіянатах свету. Мы рады, што нашы «мастачкі» сталі другімі ў свеце пасля расіянак! Гэтае срэбра блізкае да золата. Усім вядома, якія моцныя дзяўчаты ў зборнай Расіі, да таго ж у іх вельмі доўгая лаўка запасных. Я вельмі задаволена, што беларуская грацыі знаходзяцца ў моцных руках Ірыны Юр'еўны Ляпарскай, і мы ўсе ёй удзячныя.

Я таксама разабралася ў тым, што адбываецца ў айчыннай спартыўнай гімнастыцы сёння. Ёсць дакладнае разуменне, што трэба рабіць. Ёсць паразуменне і ў калектыве, поўнае ўзаемадзеянне з міністэрствам і НАК. Відавочна, што людзі жадаюць працаваць. Трэнеры і спартсмены стаміліся ад няўдач, яны памятаюць яшчэ, як беларусы стаялі на п'едэстале, і гэтую памяць нікуды не падзенеш. Ім патрэбна дапамога, і мая задача аказаць яе, максімальна мабілізаваць усе магчымасці, якімі я магу распараджацца, каб стварыць умовы для вяртання славы беларускай спартыўнай гімнастыкі.

***— Што скажаце пра іншыя віды?***

— Радуюць батутысты, у іх нядрэнна прайшоў этап Кубка свету. Там не было асноўных фаварытаў — кітайцаў, але беларусы ўсё роўна паказалі, што добра падрыхтаваны да чэмпіянату.

У свеце цяпер вялікая ўвага надаецца акрабатыцы, і мы думаем, што неўзабаве яе ўсё ж уключаць у алімпійскую праграму, а ў Беларусі гэты від спорту заўсёды быў на добрым узроўні.

### Дзяцей хапае, а вось папулярнасці спартыўнай гімнастыкі ў нашай краіне — не.

***— Шмат размоў і крытыкі паўстала гэтай восенню вакол спартыўнай гімнастыкі, а менавіта натуралізацыі дзвюх амерыканак.***

— Мы змаглі запрасіць вельмі перспектыўных дзяўчат у жаночую зборную, гэта добра. Падзея выклікала некаторы ажыятаж, і, шчыра кажучы, я гэтаму вельмі рада. Значыць, спартыўная гімнастыка не забыта. Упэўнена, самі дзяўчаты і іх бацькі свядома прынялі рашэнне выступаць за Беларусь. Яны, як ніхто іншы, ведаюць, што ў нашай краіне велізарны патэнцыял і вялікія традыцыі ў спартыўнай гімнастыцы.

Яшчэ раз хачу паўтарыць і супакоіць чытачоў — для нашай краіны і асацыяцыі гэта нічога не каштавала. Спартсменкі вельмі перспектыўныя, і, нягледзячы на тое, што, можа быць, мы разлічвалі на больш высокі вынік на чэмпіянаце свету, у іх вельмі добрая база і падрыхтоўка. Іх трэніруе выдатны спецыяліст — Артур Акапян, таму пакуль яны працягнуць рыхтавацца ў ЗША.



**Па якім шляху пойдзе наша гімнастыка далей? Алаіна КВАН, Антаніна КОШАЛЬ, Кейлі ДЗІКСАН і Алена КУЗНЯЦОВА**

***— Як паставіліся да крытыкі, якая абрынулася і на асацыяцыю ў тым ліку пасля чэмпіянату свету?***

— Абсалютна спакойна. Ды асабліва крытыкі і не было, так, пагаварылі трохі — гэта нармальна. Нас трэба і хваліць і крытыкаваць, як без гэтага? Хачу супакоіць крытыкаў, мы абсалютна дакладна ацэньвалі сітуацыю з новымі дзяўчатамі, і калі ў мяне спытаць сёння, ці паступіла б я цяпер па-іншаму, не, я зрабіла б гэтаксама.

Хтосьці пачаў параўноўваць вынікі нашых дзяўчат на чэмпіянаце Беларусі і амерыканак на чэмпіянаце свету, але не варта забывацца: судзейства на планетарных першынствах нашмат стражэйшае, чым на ўнутраным чэмпіянаце.

Вядома, сёння ёсць людзі, якім не падабаецца, што мы спрабуем нешта рабіць — гэта нармальная з'ява. Магу сказаць толькі адно: я не гатова глядзець, як мы губляем спартыўную гімнастыку. Мы працуем, і калі нават у нас нешта не атрымліваецца — гэта таксама вынік. Сядзець разважаць і бяздзейнічаць не будзем.

***— Вы казалі, што адбудуцца змены ў трэнерскім штабе зборнай. Ужо дасягнулі дамоўленасці з кімсьці са спецыялістаў?***

— Пабываўшы на чэмпіянаце свету, я ўбачыла, што на п'едэстале стаяць тыя краіны, якіх трэніравалі спецыялісты з Беларусі, Украіны і Расіі. Гэта добра, гэта сведчыць аб тым, што нашы трэнеры адны з найлепшых, і дрэнна — таму што мы не змаглі, напэўна, з эканамічных прычын утрымаць іх у сваіх краінах. Цяпер такая магчымасць ёсць, таму будзем вяртаць трэнерскі склад дадому.

Скончыўшы перамовы аб замене галоўнага трэнера жаночай зборнай, яны былі складаныя і доўгія, таму што мы хацелі атрымаць найлепшага трэнера. І вось нядаўна прыйшло пацвярджэнне, што ён гатовы падпісаць з намі кантракт з наступнага года. Мы ўжо можам назваць яго імя — гэта Алег Васільевіч Астапенка. Зараз ён заканчвае трэніраваць бразільскую зборную, сам настаўнік — ураджэнец Украіны, таму можна сказаць, што ён вяртаецца дамоў.

Я рада, што нашы дзяўчаты будуць трэніравацца ў такога прафесіянала, і мы ўскладаем на Алега Васільевіча вялікія надзеі. Чакаем яго прыезду ў снежні.

***— На фоне бурных абмеркаванняў жаночай зборнай мужчынская каманда адышла на другі план.***

— Сказаць, што я ў захапленні ад 16-га месца на чэмпіянаце свету нашых хлопцаў, не магу, але мы не разлічвалі на п'едэстал, і ўсе гэта разумелі. Выступілі горш, чым у мінулым годзе, на гэта ёсць прычыны. Але перспектыва нашых хлопцаў відавочная, спартсмены нядрэнныя. Спецыялісты адзначаюць, што ёсць праблемы, звязаныя з фізічнай падрыхтоўкай, таму будзем ставіць пытанне аб з'яўленні асобнага трэнера, які адказвае за гэты складнік. Ёсць пытанні да лекараў: збоку, што адбываліся на чэмпіянаце свету са спартсменамі, было занадта. А ўвогуле, узровень мужчынскай зборнай у нас вышэйшы за жаночы.

***— Што будзеце мяняць у сістэме падрыхтоўкі дзяцей?***

— Цяпер мы займаемся гэтым пытаннем, дзяцей хапае, а вось папулярнасці спартыўнай гімнастыкі ў нашай краіне — не. Аб ёй мала гавораць, яе мала паказваюць, натуральна, знікае цікавасць, а адсюль і памяншаецца колькасць ахвотных. У нас ёсць выдатныя залы ў Магілёве, Гродне, Мінску, але ўсюды праблема з трэнерскім складам. Настаўнікі імкнуцца ехаць туды, дзе ім могуць больш заплаціць, дзе на спартыўную гімнастыку звяртаюць увагу. Мы маем намер выпраўляць сітуацыю і вяртаць трэнерскую эліту ў Беларусь.

Будзем праводзіць больш дзіцячых турніраў, хай яны нават носяць не столькі спаборніцкі характар, колькі паказальны, але гэта таксама паўплывае на папулярызацыю спартыўнай гімнастыкі. Хутка адкрыецца абноўленая зала на Каліноўскага, туды пераедзе жаночая зборная, сёння ў нас ёсць добрыя юніёркі, будзем з імі працаваць.

***— Усе прызнаюць, як выдатна Мінск прыняў чэмпіянат Еўропы па мастацкай гімнастыцы. Ці плануецца яшчэ правядзенне буйных міжнародных турніраў у Беларусі?***

— Па мастацкай гімнастыцы ў наступным годзе мы правядзём этап Кубка свету, а па спартыўнай будзем прэтэндаваць на прыняцце чэмпіянату свету або Еўропы ў найбліжэйшыя свабодныя даты. Мы робім гэта абсалютна свядома, хочам падштурхнуць сваіх спартсменаў, таму што, калі чэмпіянат праходзіць у роднай краіне, яны заўсёды па-асабліваму рыхтуюцца да такой падзеі. Ну і для папулярызацыі гэтага віду спорту такія мерапрыемствы таксама вельмі добрыя, бо гэта ўжо далёка не тая гімнастыка, што была 10-15 гадоў таму. Цяпер гэта прыгожыя касцюмы, залы, антураж.

***— Чаго чакаеце ад наступнага года?***

— Галоўнае — дамагчыся ўсіх магчымых ліцэнзій на Алімпіяду. А наша задача — стварыць добрыя ўмовы для падрыхтоўкі спартсменаў да Гульняў. З усімі трэнерскімі складамі ў нас будзе размова, каб не замоўчвалі праблемы, казалі, што трэба, чаго не хапае. Сёння ёсць магчымасць ствараць усе ўмовы, галоўнае, каб была ініцыятыва і жаданне. Я ўжо папярэджвала ўсіх нашых настаўнікаў, што спасылацца на недахоп грошай не варта. Галоўнае — разумець, пад што патрэбны сродкі, і тады, натуральна, мы гатовы будзем іх шукаць. Тым больш, што Міністэрства спорту і Нацыянальны алімпійскі камітэт аказваюць нам усялякую падтрымку. Так што я чакаю ініцыятыву, заснаваную на прафесійным вопыце. Магчымасці ёсць, ёсць спонсары, ёсць неабыякавыя людзі. Будзем працаваць, радаваць нас усіх і праслаўляць Беларусь.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

Ігуменскі тракт
№ 42 (143)

■ Дакрануцца да вытокаў

# РУЧНІК, КАЗКА І МУЗЫЧНАЕ ЯЙКА

**Міжнародны форум «Традыцыйная культура як стратэгічны рэсурс устойлівага развіцця грамадства», які прайшоў у Магілёве, вярнуў да вытокаў народнай творчасці і нагадаў, як важна захоўваць старадаўнія традыцыі.**

## Купальскі пояс даўжынёй... 100 метраў

Ручнікі, валёнкі, саламяныя павукі, вышытыя сурвэткі, свістулькі, драўляныя бочкі — ад выбару ўсяго народнага і самабытнага вочы разбягаліся. Чацвёрты міжнародны форум зноў даў магчымасць упэўніцца, наколькі багатая і разнастайная на Магілёўшчыне культура. Цікавасць да яе праявілі знаўцы фальклору і народных традыцый з 11 краін блізкага і далёкага замежжа.

— Удзельнікі форуму жадаюць ведаць тую методыку, той механізм, які мы выкарыстоўваем, паглядзець, што мы назапасілі за мінулыя гады, — падкрэсліў **міністр культуры Беларусі Барыс СВЯТЛОЎ.** — Народная творчасць ляжыць у аснове ўсяго нашага сучаснага прафесійнага мастацтва. Наогул, гэты форум унікальны, ён адзіны ў Беларусі. Яго можна назваць своеасаблівым брэндам Магілёва і вобласці.

У Магілёўскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы працуюць сапраўдныя натхняльнікі, якія не стамляюцца адкрываць новых майстроў і заахвочваць моладзь займацца старадаўнімі рамёствамі. Тут адбываюцца розныя адукацыйныя праграмы і семінары, рэалізуюцца цікавыя праекты. Як, напрыклад, апошні, калі майстрыхі з усёй вобласці ткалі купальскі пояс да сёлетняга фэсту ў Александрыі.

— Першую ніточку заклала самая маладая наша ткачыха, а апошнюю — найстарэйшая, — кажа **метадыст цэнтра Наталля ДАМІНІКАВА.** — Усе нашы дзяўчаты прыязджалі з раёнаў і па чарзе ткалі. Працэс не прыпыняўся нават на Купалле, і кожны, хто падыходзіў да нас, мог паспрабаваць сябе ў якасці ткачыхі. Зараз стаіць задача — падоўжыць пояс да 100 метраў. Хацелася б, каб да нас далучылася як мага больш новых ткачых. Дарэчы, самай маладой з нашых рукадзельніц 19 гадоў.

У вобласці шмат унікальных майстроў. Зараз у Магілёве адраджаюць роспіс па шкле. Таленавітая мастак-дызайнер Вольга Белаконь стварае сапраўдныя шэдэўры. У Бабруйскім раёне жыве сям'я Арловых, якая займаецца ганчарствам. Іх старэйшы сын, якому 19 гадоў, ужо член Саюза майстроў — самы малады ў гэтай арганізацыі. У Глуску жыве добры майстар па пляценні з лазы. А ў Слаўгарадскім раёне, дзе знаходзіцца наймаладзейшы ў вобласці Дом рамёстваў, адраджаюць вышыўку, якая характэрна менавіта для гэтай мясцовасці.

— Форум папулярызуе народную творчасць, дзякуючы яму мы захоўваем свае здабыткі і традыцыі. За тыя 4 гады, што ён праводзіцца, шмат чаго адрадзілі і аднавілі, — радуецца Наталля Вітольдаўна.



Той самы купальскі пояс.


Мурад Курбанаў у захапленні ад народных інструментаў Мар'яна Скрамблевіча.

## У стылі Фабержэ

**Старшы выкладчык кафедры гісторыі музыкі Туркменскай нацыянальнай кансерваторыі Мурад КУРБАНАЎ** у Беларусі наогул гасціў упершыню.

— Пра вашу краіну ведаў толькі па гістарычных звестках, але ўражанні ад наведвання аказаліся мацнейшымі, — прызнаўся ён. — Я не чакаў убачыць такога багацця народных інструментаў. Калі паглыбіцца ў іх гучанне, можна пачуць імітацыі галасоў розных птушак і жывёл. Гэта і ёсць тое, што называецца нематэрыяльнай каштоўнасцю. Такое трэба берагчы.

Мурад Курбанаў як зачараваны стаяў каля століка Мар'яна Скрамблевіча, знакамітага беларускага рэзчыка музычных інструментаў з аграгарадка Адэльск Гродзенскага раёна. Яго творчасць занесена ў спіс як нематэрыяльная культурная каштоўнасць Беларусі. На форум ён прывёз шмат чаго: ражкі, флейты, жалейкі, дудкі-паршнёўкі... Былі і наогул эксклюзіўныя асобнікі, напрыклад, акарына з рога, дрымба.

Звяртаю ўвагу на музычныя інструменты ў выглядзе курыльных трубак з дзірачкамі па баках.

— Гэта каб людзі не курылі, — усміхаецца Мар'ян Антонавіч і паказвае нешта накшталт яйка Фабержэ, толькі з невялічкімі адтулінамі. — А вось адзінае ў свеце музычнае яйка.

**Супрацоўнік Інстытута археалогіі і этнаграфіі Нацыянальнай акадэміі навук Арменіі, кандыдат філалагічных навук Арусяк СААКЯН** — пастаянная ўдзельніца ўсіх 4 фестываляў. Яна не перастае захапляцца пачутым і ўбачаным.

**«Усе нашы дзяўчаты прыязджалі з раёнаў і па чарзе ткалі. Працэс не прыпыняўся нават на Купалле, і кожны, хто падыходзіў да нас, мог паспрабаваць сябе ў якасці ткачыхі. Зараз стаіць задача — падоўжыць пояс да 100 метраў».**

— Беларусь ужо стала маёй другой радзімай, я кожны год вяртаюся сюды, як дадому, — кажа яна. — Вы проста прывыклі і не заўважаеце, які ў вас цудоўны, таленавіты народ. І нас шмат што звязвае. Вашы карані з Арменіі, з Арарата. І не толькі таму, што гэта тое месца, куды прычаліў Ноеў каўчэг. Славяне жылі там і адтуль праз Егіпет, праз Міжземнамор'е трапілі ў Еўропу, а потым праз вашу тэрыторыю ў Расію. Так што мы ўсе адной крыві.

На навукова-практычнай канферэнцыі Арусяк Саакян прадстаўляла нематэрыяльную культурную спадчыну сваёй краіны — казку. Апошняя, на яе погляд, можа навучыць многаму, бо добра адлюстроўвае ўсе тыя перыяды спаду і пад'ёму, якія адбываюцца ў нашым жыцці.

— З 60-х да 80-х гадоў быў культурны ўзлёт, якому папярэднічаў спад, — тлумачыць Арусяк. — З'явіліся «Бітлз», іншыя гурты, якія вярталіся да вытокаў, ігралі кантры-музыку. Зараз зноў ёсць такая патрэба. Калі казка заканчваецца дабром (гэта абавязковае жанравае патрабаванне), не значыць, што наогул няма зла. Барацьба працягваецца, трэба захаваць баланс. Зараз у нас перыяд падзення маральнага, духоўнага. Але потым зноў пачнецца пад'ём. І форум вельмі гэтаму спрыяе. Перамовы і пазнанне адзін аднаго, супрацоўніцтва народаў ідзе не толькі на ўзроўні кіраўніцтва.

## Ад прадзедаў спакон вякоў...

— Быў час, калі мы саромеліся казаць пра лапці, народную творчасць, саломку. Сёння — гэта наш здабытак, — кажа **дырэктар Магілёўскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы Алег ХМЯЛЬКОЎ.** — І Магілёўшчына адной з першых пачала працу па адраджэнні спадчыны. Сёння ў спісе нематэрыяльных каштоўнасцей Беларусі 11 розных абрадаў, рамёстваў і традыцый ад нашай вобласці. Мы ўжо другі тэрмін старшынствуем у савеце дырэктараў цэнтраў народнай творчасці Беларусі і з'яўляемся злучальным звяном паміж рознымі краінамі, з якімі ў нас падпісана пагадненне.

Удзельнікі форуму ў адзін голас казалі, неабходна з маленства выхоўваць у дзяцей цікавасць да жыцця іх продкаў. Калі бацькі не будуць ім укладваць у вушы гэтую інфармацыю, нічога не атрымаецца. Культура — гэта тое, што павінна ўспрымацца на падсвядомым узроўні. Бо культурныя адрозненні не менш важныя, як і нацыянальныя.

Выставы, круглыя сталы, прэзентацыі, якія адбываюцца ў рамках форуму, даюць магчымасць не толькі паказаць сябе, але і паглядзець на культурныя здабыткі іншых. Тэма, якая была абрана для канферэнцыі «Нематэрыяльная культурная спадчына: сучасны стан, рызыкі і праблемы захавання і актуалізацыі», сёння наогул актуальная для ўсіх краін без выключэння. «Нам цікавы традыцыі і здабыткі іншых краін, — кажа **начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама Анатоль СІНКАВЕЦ.** — Мы дэманструем наш вопыт і бяром на ўзбраенне іншы. Кожны ўдзельнік дае нешта сваё і сам мае магчымасць атрымаць вялікі метадычны матэрыял для далейшай працы». Прадстаўнікі Турцыі, якія ўпершыню наведалі магілёўскі форум, вельмі дакладна абазначылі яго галоўную ідэю: «Такога кшталту падзеі з'яўляюцца спосабам падтрымання міру і раўнавагі. Культурная спадчына павінна збірацца па ўсім свеце. Патрэбна, каб культура, музыка і танцы былі ўключаны ў палітычнае жыццё. І тады мы будзем ставіцца адзін да аднаго з большай павагай».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*
**Фота аўтара**


Магілёўскім майстрам ёсць чым пахваліцца.

■ З граніту і бронзы

# НА ЎЗРОЎНІ НАШЫХ ВАЧЭЙ

## У Мінску хутка можа з'явіцца помнік Васілю Быкаву

**У майстэрні скульптара Аляксандра БАТВІНЁНКА — творчы беспарадак. Са стэлажоў на гасцей паглядаюць Тэадор Нарбут (дарэчы, зямляк майстра), Уладзімір Караткевіч і многія іншыя значныя для нашай гісторыі персоны. Нядаўна тутэйшы «пантэон» папоўніўся макетам скульптуры яшчэ адной, без сумнення, вябітнай і легендарнай асобы — народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава. Некалькі гадоў у творчым тандэме з архітэктарам Арменам САРДАРАВЫМ ішла праца над стварэннем помніка аднаму з самых вядомых у свеце пісьменнікаў-франтавікоў. Цяпер праект фактычна гатовы да рэалізацыі. Пра гісторыю працы над манументам карэспандэнту «Звязды» распавялі яго аўтары.**

Класік, трохі згорбіўшыся, сядзіць у задуменнай позе. Яго рукі, сашчэпленыя разам, ляжаць на працоўным стале ў форме чырвонай пяціканцовай зоркі. Кожная з яе граняў сімвалізуе раскрытую кнігу, унутры якой будуць напісаны цытаты з твораў пісьменніка. На макеце, які знаходзіцца ў майстэрні Аляксандра Батвінёнка, вытрымак, праўда, няма, але калі з'явіцца паўнавартасны помнік...

— За гэтую працу я ўзяўся ў першую чаргу таму, што сама персона Васіля Уладзіміравіча для мяне вельмі шмат значыць, — распавядае Армен Сардараў. — Найперш, гэта маладосць, студэнцкія гады. У далёкія ўжо 60-я у нас быў сфарміраваны погляд на Вялікую Айчынную вайну, які я назваў бы парадна-пафасным. Не скажу, што гэта дрэннае ўспрыманне, бо на першы план у тагачасным мастацтве на ваенную тэматыку выходзіў савецкі народ, што правільна. Але раптам з'явіўся пісьменнік, які паставіў на галоўнае месца ў вайне асобу чалавека. Адчуванне няўпэўненасці, перажыванні, роздумы, уласцівыя ўсім нам, — гэта стала для нас адкрыццём. З таго ўсё пачалося, і творчасць Быкава не пакідае мяне ўсё маё жыццё.

— Творы Васіля Уладзіміравіча — гэта тое, што можна супрацьпаставіць сучаснасці, — кажа Аляксандр Батвінёнак. — Цяпер катэгорыі «чорнага» і «белага» амаль адсутнічаюць у нашым жыцці, мы пра многае гаворым усярэднена. А ў Васіля Быкава ўсё вельмі проста і, я лічу, правільна: ты альбо здраднік, або герой, трэцяга не бывае. Можна схавацца, збегчы, але выбар усё адно давядзецца зрабіць. Можа, менавіта з прычыны гэтага ўзнікае такі феномен — творы аўтара з цягам часу не проста захоўваюць актуальнасць, але і набываюць яе. Пісьменнік яскрава паказвае нам шляхі, якія вядуць або да пад'ёму, або да занядаду, ён — выдатны маральны арыенцір.

Яшчэ ў 1982 годзе скульптар задумаў кампазіцыю — прысвячэнне франтавікам Беларусі ў якасці сваёй дыпломнай працы. У тым варыянце класік быў апрануты павайсковаму і быццам бы даваў прысягу. Праца трапіла на выставу, дзе яе набыла Акадэмія навук. Сучасны ж праект быў задуманы ўжо як помнік. «Ідэя — у першую чаргу ў папулярызацыі твораў Быкава, — тлумачыць Аляксандр Батвінёнак. — Для гэтага і выкарыстоўваюцца радкі з яго кніг. Гэта праслаўленне Быкава нават не як чалавека, з яго ўласнымі праблемамі і асабістым жыццём, а як аўтара выдатных тэкстаў».

Адным з ініцыятараў праекта стаў старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі і сябар Васіля Быкава Мікалай Чаргінец. Ён падтрымаў ідэю і дагэтуль аказвае аўтарам самую розную падтрымку. «Як чалавек, які таксама прайшоў вайну, Мікалай Іванавіч не можа не разумець значнасць помніка творчасці Васіля Быкава», — лічыць скульптар.

Манумент плануецца ўсталяваць побач з Домам літаратара на вуліцы Румянцава. Гэта цэнтр горада, але не самае шматлюднае месца. Чаму?

— Мы вельмі доўга шукалі пляцоўку, на якой Быкаў выглядаў бы арганічна, — кажа Армен Сардараў. — Хадзілі ў раёне парку Горкага, разглядалі фасады. Але найлепшым варыянтам падаўся менавіта гэты. Не сакрэт, што сам Васіль Уладзіміравіч быў вельмі замкнёным чалавекам, можна нават сказаць — пустэльнікам. Жыў у Гродне, а ў Мінск пераехаў толькі напрыканцы 70-х. Рэдка з'яўляўся на публіцы, і калі нешта сапраўды цаніў — то найперш сваіх блізкіх сяброў, калег па пісьменніцкім «цэху». Таму мы спыніліся на даволі камернай прасторы, без стаметровых плошчаў, на якіх ускладаюць вянкі. Вось тут — зусім побач, у цішыні — гэты чалавек. Думаю, такое месца будзе адпавядаць характару Васіля Уладзіміравіча. Ды і, я ўпэўнены, у такой прасторы гэты вобраз сам пакажа сябе, а пры сваёй архітэктурнай камернасці месца ўсё адно стане знакавым, дзякуючы помніку.

Па словах аўтараў, сваю ролю адыграе і плошча Перамогі, якая знаходзіцца зусім блізка. Там — велізарны манумент, грандыёзны па сваёй сіле, а зусім побач — помнік чалавеку, які паказаў, чаго была варта гэтая Перамога. Па задуме архітэктара, навакольная прастора таксама будзе зменена. У прыватнасці, абрысы зоркі будуць перахадзіць у чырвоны і чорны брук.

Асобна аўтары распавядаюць пра паралелі з папулярнай цяпер вулічнай скульптурай. Па словах Армена Сардарава, выкарыстанне помніка невялікага маштабу дазволіць гаварыць з гарадскімі жыхарамі на прывычнай ім мове і ў той жа час падкрэсліць сакральнасць вобраза Быкава. «Манумент будзе трохі большым за натуру, — кажа Аляксандр Батвінёнак, падымаючы макет вышэй. — Гэта зроблена дзеля таго, каб чалавек мог «размаўляць» з помнікам, не задзіраючы пры гэтым галавы. Рукі класіка будуць знаходзіцца на ўзроўні вачэй чалавека».

Сам вобраз створаны на аснове асабістых успамінаў аўтараў. Скульптар узгадвае, як хадзіў на творчыя сустрэчы з Васілём Уладзіміравічам, якія праводзіў іх агульны сябра — Міхаіл Савіцкі. «Адзінае, аб чым шкадую, — кажа майстар, — пасаромеўся пазнаёміцца асабіста. Таму ў асноўным карыстаўся фотаматэрыяламі, відэаздымкамі, хаця і сам я нядрэнна памятаю знешні выгляд Васіля Уладзіміравіча. Калі адзначалася 90 гадоў з дня нараджэння пісьменніка, мой драўляны макет выстаўляўся на экспазіцыі ў музеі Максіма Багдановіча і мне перадавалі словы ўдавы Быкава Ірыны аб тым, што вобраз атрымаўся вельмі падобным».

— Я мяркую, што калі цяпер такі помнік у Мінску з'явіцца, гэта стане надзвычай важнай падзеяй, — лічыць Аляксандр Батвінёнак. — На фоне таго, што адбываецца ў нашых суседзяў, калі знішчаецца памяць цэлых пакаленняў, калі слова «фашызм» перастае ўжывацца толькі ў гістарычным кантэксце, вобраз Быкава можа паказаць наша стаўленне да гэтага. Бо Васіль Уладзіміравіч быў самым зацятым барацьбітом з фашызмам, прычым ва ўсіх сэнсах. І самае галоўнае — за аўтара ўсё скажуць словы з яго твораў.

— Вярнуўшыся да вобраза Быкава, мы зможам сказаць пра вельмі важныя рэчы, асабліва нашай моладзі, — дадае Армен Сардараў. — Пры ўсім развіцці новых тэхналогій, дасягненнях прагрэсу, у душах маладых людзей працягваецца ўсё тая ж барацьба, што і заўсёды, — змаганне дабра са злом. І яшчэ адзін аспект — гэта народная памяць. Разбураючы многае ў нядаўнім мінулым, мы не задумаліся аб стварэнні новага. Як прыклад прывяду гісторыю з дэмантажом помніка Леніну ў сталіцы, які планаваўся напачатку 1990-х — я тады выступіў з асуджальным артыкулам у друку. Нават калі не ўздымаць пытання архітэктуры (а помнік Манізера ў ансамблі Лангбарда выглядае максімальна арганічна), то адмова ад уласнай памяці ні да чаго добрага не давядзе. Змагацца з праблемамі трэба спачатку ўнутры сябе, а не хапацца за помнікі. Падаць на калені нікто ж не прымушае, але і ломам ламаць... Помнік Быкаву — гэта голас чалавека, які не дасць нам страціць сваю памяць.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** lyskavets@zviazda.by



Фота Надзеі БУЖАН.

Аляксандр БАТВІНЁНАК і Армен САРДАРАЎ — аўтары манумента.

■ Фаліянты

## СКАРЫНА ЗЛУЧЫЎ КРАІНЫ-СУСЕДКІ

**20—21 лістапада 2015 года ў гістарычным цэнтры старой Вільні прайшлі святкаванні 525-годдзя беларускага першадрукара і заснавальніка першай у Вялікім Княстве Літоўскім друкарні Францыска Скарыны.**

Адной з ключавых падзей святкавання стала міжнародная навуковая канферэнцыя «Кніжная традыцыя Вялікага Княства Літоўскага», прысвечаная ўгодкам Францыска Скарыны. У рамках яе адкрыцця адбылася прэзентацыя і ўрачыстая цырымонія передачы ў дар факсімільнага выдання кніжнай спадчыны першадрукара. Камплекты з 11 тамоў атрымала Нацыянальная бібліятэка Літвы імя М. Мажвідаса, бібліятэка Віленскага ўніверсітэта, бібліятэка Акадэміі навук Літвы імя Урублеўскіх, а таксама Віленская беларуская гімназія імя Ф.Скарыны.

Вялася размова пра выпуск некалькіх супольных беларуска-літоўскіх кніг да свята 500-годдзя кнігадрукавання.

Сімвалічна, што мерапрыемства праходзіла ў двухбаковым беларуска-літоўскім фармаце, паколькі дзейнасць Скарыны і многіх яго паслядоўнікаў лучыць нашы культуры. Францыск Скарына, які нарадзіўся ў Полацку, вучыўся ў Кракаве і Падуі, друкаваў свае кнігі ў Празе і Вільні, злучыў гэтая гарады непарыўнай сувяззю. Менавіта ён надрукаваў першую беларускую кнігу і першую кнігу на тэрыторыі сучаснай Літвы.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

■ Майстры

## СПРАВЫ «Ў АЖУРЫ»,

### або Коўка як мастацтва

**Як вядома, кавальства — рамяство старажытнае, але ў XXI стагоддзі яно не страціла сваёй аўры і прывабнасці. І хоць прафесія гэта сёння не трэндавая, але ж і не забытая. Ды і ў майстэрнях — калі туды завітаць — чуецца і груканне молата, і гудзенне сучасных прылад па апрацоўцы металу.**

**Пераканаліся ў гэтым нашы журналісты, пабываўшы ў невялікай глыбоцкай кузні з рамантычнай назвай «У ажуры».**



Юрый ТАТАРЫНОВІЧ са сваімі «героямі».

Сустрэў нас гаспадар Юрый Татарыновіч. З металам ён працуе ўжо даўно. А пачалося гэта, як часта здараецца ў жыцці, выпадкова.

На календары 1985 год. Глыбокае сустракае ганаровых гасцей: у горад з'ехаліся кавалі з усяго свету — падзяліцца вопытам ды падзівіць жыхароў сваімі шэдэўрамі. Назіралі за працай майстроў тысячы людзей, сярод якіх быў і Татарыновіч, на той момант выкладчык Глыбоцкага прафесійна-тэхнічнага вучылішча. Натхнёны ўбачаным, Юрый Мар'янавіч прыйшоў дадому і... рукі самі пацягнуліся да працы. Першую работу выкінуў за плот — атрымалася спрытная качарга з ружай. Выкаваў ды і забыўся. Час ішоў, Татарыновіч пачаў працаваць аўтамеханікам, справу часцей даводзілася мець са зваркай, чым з кавадлам.

*— Толькі праз дваццаць гадоў пасля з'яўлення першай качаргі я ўзяўся за выраб узорыстых варот для свайго дома. Атрымалася нядрэнна. Ад знаёмых, сяброў, сваякоў адразу пасыпаліся заказы. Тады і падумаў: чаму б не заняцца гэтым усур'ёз?*

Пяць гадоў таму Юрый Мар'янавіч адкрыў кавальню «У ажуры». За гэты час каманда майстра вырасла з двух чалавек да шаснаццаці, паднабраліся вопыту і ўмення, з маленькага памяшкання пераехалі ў новы цэх. Сёння тут бібікі ніхто не б'е — заказаў шмат, працуюць хутка і спрытна.

Юрый Татарыновіч ведае шмат тонкасцяў і нюансаў сваёй справы. Ён з запалам расказвае і пра стварэнне ручных вырабаў, і пра сучасныя станкі, якія дапамагаюць скарацiць час працы і вырабіць усе элементы з дакладнасцю да міліметра. Узнікае пытанне, ці не страціла прафесія каваля ў сувязі з тэхнічным прагрэсам сваёй спецыфікі?

*— Канкураваць з ручной працай мы першапачаткова не збіраліся. Наша задача — прыйсці ў народ з больш таннымі вырабамі. З'яўляюцца і незвычайныя заказы, але іх вельмі мала. Заказчыкі часцей выбіраюць тое, што не вельмі ўдарыць па іх кашальку.*

На вуліцах Глыбокага можна сустрэць шмат ажурнай прыгажосці: ад высокіх брам да незвычайных помнікаў. Яны ствараюць непаўторны каларыт, не дзіва, што ў горад як магнітам цягне турыстаў.

Фотаўспышкі камер часцей за ўсё мільгаюць каля помніка вялікаму фантазёру барону Мюнхгаўзену.

*— Працавалі мы над ім два месяцы. Наш барон атрымаўся вялікім (тры з паловай метры) і статным. Мы пасадзілі яго на ядро, глядзіш — вось-вось вылеціць з гарматы, — з усмешкай кажа каваль.*

Месціцца скульптура непадалёк ад уваходу на старыя могілкі. Месца выбрана не выпадкова: не так даўно тут знайшлі магілу Мюнхгаўзена. Вядома, пахаваны там не сам барон Карл Фрыдрых Еранім, а нехта Фердынанд — ці то цёзка, ці то сваяк. Але легенда ад гэтага не становіцца менш прыгожай і прывабнай, наадварот, толькі прыцягвае ў горад цікаўных.

Нездарма Глыбокае называюць беларускай Венецыяй — азёр тут не злічыць: Кагальнае, Бяглец, Мушкат... Таму, калі будзеце ў гэтых краях, наведайце іх усе і абавязкова прагуляйцеся па алеі ліхтароў, што цягнецца ўздоўж возера Доўгага. Каго вы там толькі ні сустрэнеце: ліхтар з вудай збіраецца на рыбалку, ліхтар-анёлак распраўляе свае крылы, ліхтар-музыка іграе на сваёй скрыпачцы. Безліч крэатыву!

А сваім самым грандыёзным праектам Юрый Мар'янавіч лічыць «каралеўскую» карэту.

*— Выкоўвалі яе пяць месяцаў, і сёлета яна ва ўсёй красе з'явілася на вуліцах горада. Маладыя, якія бяруцца шлюбам, і ўсе глыбачане на нейкі час могуць ператварыцца ў каралеўскіх асоб, арандаваўшы гэты старадаўні від транспарту.*

У задумах — новыя праекты і ідэі, пашыраецца і геаграфія заказаў. Магчыма, неўзабаве ва ўсім свеце будуць ведаць таленавітых беларускіх майстроў.

**Хрысціна ХІЛЬКО.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
## по продаже земельных участков в агрогородке Ёдки Третьяковского сельсовета Лидского района в частную собственность

**Аукцион состоится в 11.00 24 декабря 2015 г. в г. Лида Гродненской обл. по ул. Советской, 8.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209 с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 18 декабря 2015 г. до 15.00**

